Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

9 ЛІСТАПАДА 2022 г.
СЕРАДА
№ 220 (29842)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ФАБРЫКА СМЕРЦІ Ў ЧОНКАЎСКІМ ЛЕСЕ 6

МЯСЦОВЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ Ў ДЗЕЯННІ МС

КАРАТКА

- **У Белавежскай пушчы пачалі падрыхтоўку да зімовых свят.**
- У Беларусі студэнты ВНУ змогуць бясплатна атрымаць рабочую спецыяльнасць.
- **Сусветная метэаралагічная арганізацыя ААН: перыяд з 2015 да 2022 года стаў самым цёплым за ўсю гісторыю назіранняў.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксей БЯГУН, начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС:

«Штогод тысячы замежнікаў хадайнічаюць аб прыёме ў беларускае грамадзянства. Паводле інфармацыі МУС, сёлета разгледжана ўжо 4075 такіх дакументаў. У асноўным гэта звароты ўкраінцаў: 2811 жыхароў Украіны звярталіся па беларускае грамадзянства. З агульнай колькасці станоўчае рашэнне прынята па 3997 іншаземцах. Органы ўнутраных спраў разглядаюць звароты ў самыя кароткія тэрміны, а ў шэрагу выпадкаў робяць тое і ў спрошчаным парадку. Усё гэта з'яўляецца пацвярджэннем адкрытасці нашай краіны для законапаслухмяных і працавітых людзей. Такая палітыка на працягу многіх гадоў застаецца нязменнай і паспяхова рэалізоўваецца. Тым, хто выказвае жаданне стаць часткай нашага грамадства, неабходна пастаянна пражываць у Беларусі на працягу пяці гадоў, мець легальную крыніцу існавання, выконваць палажэнні Канстытуцыі і заканадаўства. Кожны пункт абавязковы да выканання».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Трэба абавязкова пераканаць усіх нашых людзей жыць па законе»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па законапраектах, якія прадугледжваюць карэкціроўку законаў «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь» і «Аб нарматыўна-прававых актах». Кіраўнік дзяржавы прымае актыўны ўдзел у абмеркаванні нарматыўна-прававых актаў, якія ўдасканальваюцца ў развіццё абноўленай Канстытуцыі. На ўзроўні Прэзідэнта ўжо разглядаліся падыходы да праекта закона аб Усебеларускім народным сходзе і змены ў выбарчае заканадаўства.

Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, аб чым ідзе гаворка і чаму гэтае пытанне мае вялікае значэнне для краіны: «Нядаўна народ Беларусі прыняў новую Канстытуцыю, папраўкі ў яе. Народ падтрымаў усё тое, што мы прасілі. Зразумела, што Канстытуцыя — гэта Асноўны Закон, які фарміруе каркас любога грамадства любой краіны. Прынятая новая Канстытуцыя, зразумела, вызначае асноўныя напрамкі светаўладкавання Беларусі і саму Беларусь. У развіццё асноўных палажэнняў звычайна ў шырэйшым маштабе або ў больш вузкім у залежнасці ад змянення у Канстытуцыю мы ўдасканальваем заканадаўства краіны і, магчыма, прымаем новыя нарматыўна-прававыя акты».

СТАР. 2

Транспарт

ПА ДАРОГАХ КРАІНЫ

Працягваецца развіццё аўтамабіляў на альтэрнатыўных відах паліва

Сёння асноўная ўвага ў транспартнай сферы краіны прыкаваная да стварэння камфортных і бяспечных аўтамабільных дарог. Згодна з Дзяржаўнай праграмай «Дарогі Беларусі» на 2021 — 2025 гады, сёлета былі запланаваны работы па рамонце, узвядзенні і рэканструкцыі каля 700 кіламетраў рэспубліканскіх аўтадарог, а таксама шэрагу дарожных збудаванняў. Як паведаміў намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Рыгор ГЛАЗКО, гэтыя задачы выканальныя.

БОЛЬШ ЗА ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ КІЛАМЕТРАЎ ДАРОГ І ДАДАТКОВА 77 МАСТОЎ

У бягучым годзе першапачаткова планавалася адрамантаваць крыху больш за 500 кіламетраў дарог і 2315 пагонных метраў дарожных збудаванняў рэспубліканскай сеткі, а таксама не менш за 1100 кіламетраў дарог і 1084 пагонныя метры мастоў мясцовага падпарадкавання.

Рыгор Глазко адзначыў, што ў дзяржпраграму ўключаны аб'екты, фінансаванне якіх павінна ажыццяўляцца за кошт як бюджэту, так і крэдытаў замежных банкаў. Аднак з-за ўвядзення санкцый выдзяленне крэдытных рэсурсаў з боку банкаў прыпынена. Таму ўрадам прынята рашэнне аб дадатковым выдзяленні на патрэбы дарожнай гаспадаркі краіны 300 мільёнаў рублёў. З дадзенай сумы 200 мільёнаў накіраваныя на рамонт рэспубліканскіх аўтадарог і маставых збудаванняў, а 100 мільёнаў рублёў — на падтрыманне мясцовай сеткі.

Паводле ацэнак транспартнага міністэрства, гэта дазволіць дадаткова адрамантаваць 250 кіламетраў рэспубліканскіх і 425 кіламетраў мясцовых дарог.

СТАР. 3

АСЦЯРОЖНА, ЦЫГАРЭТА!

Як не дапусціць вогненных трагедый і не стаць ахвярай агню?

Непатушаная цыгарэта — прычына многіх няшчасцяў. Менавіта з-за яе, як паведамляюць ратавальнікі, здараецца больш за ўсё пажараў, якія заканчваюцца стратай маёмасці і гібеллю людзей. Часта агонь, а адпаведна і непатушаная цыгарэта, забірае не адно жыццё.

НЕВЯСЁЛЫЯ ГІСТОРЫІ

Неаднойчы ратавальнікі нагадвалі насельніцтву (і працягваюць гэта рэгулярна рабіць), што за ўласную бяспеку адказвае сам чалавек. Аднак многія, як паказвае сумны вопыт, грэбуюць элементарнымі правіламі бяспекі, што вельмі часта прыводзіць да непапраўнага. Прычым з-за сваёй бяспечнасці і самаўпэўненасці той, хто неасцярожна абыходзіцца з агнём, рызыкуе не толькі сабой, а і жыццём іншых.

Так, у прыватнасці, здарылася ў Стоўбцах. Выпадковы мінак паведаміў у Цэнтр аператыўнага ўпраўлення Стаўбцоўскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, што бачыць дым, які ідзе з веранды аднаго з прыватных дамоў. Ратавальнікі, якія прыбылі на месца здарэння, устанавілі: гарыць гаспадарчая пабудова, прыстасаваная для пражывання людзей. На падлозе былі выяўлены мужчына і жанчына, якія не падавалі прыкмет жыцця. Як пазней устанавілі праваахоўныя органы, прычынай іх гібелі стала цыгарэта, якую гаспадар закурыў перад сном і, натуральна, не змог патушыць, бо заснуў.

«Герою» іншай вогненнай гісторыі пашанцавала. Ратавальнікам Мінскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях паступіла паведамленне аб узгаранні ў ангары ў вёсцы Хадакова Шчомысліцкага сельскага Савета. Падчас праведзенай праверкі было высветлена: узгаранне адбылося ў будынку, які не эксплуатуецца.

СТАР. 4

«Трэба абавязкова пераканаць усіх нашых людзей жыць па законе»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што ў адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй уводзіцца новая структура — Усебеларускі народны сход. Кіраўнік дзяржавы ставіць задачу акуратна ўманціраваць УНС у сістэму дзяржаўнага ладу, якая функцыянуе сёння. І пры гэтым вельмі важна не ламаць гэтую сістэму. «Ні ў якім разе ніякай ломкі быць не павінна», — арыентуе беларускі лідар. ***«Калі мы пачнём крута ламаць, то гэта амаль рэвалюцыйныя пераўтварэнні. Да чаго яны прыводзяць, мы бачылі ў сярэдзіне 90-х, калі зламалі краіну. Таму ўсё павінна лагічна расці з таго досведу, які мы маем»***, — растлумачыў ён. Гэта тычыцца і УНС, і карэкціроўкі палажэнняў аб функцыях Прэзідэнта, парламента, Савета Міністраў, іншых органаў улады.

«Трэба разумець, што Канстытуцыя — аснова нашага жыцця, і трэба абавязкова пераканаць усіх нашых людзей жыць па законе. Я хачу, каб вы разумелі, што гэта не проста ўзяў і сказаў: жыць па законе. Гэта ж не я прыдумаў, усе пра гэта гавораць. Я гэта спецыяльна падкрэсліваю. Таму што нашы людзі часта жывуць, арыентуючыся на асоб, перш за ўсё на Прэзідэнта, на парламент, дэпутатаў, Савет Міністраў і гэтак далей», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён прызнаў, што ні ў адной краіне грамадзяне не валодаюць шырокімі ці нават усёабдымнымі ведамі Канстытуцыі і законаў, ды гэта і не трэба.

«Закон і заканадаўства склалі нейкі лад жыцця ў той ці іншай краіне, у прыватнасці ў Беларусі. І людзі разумеюць, выходзячы з гэтай карціны, што рабіць можна, а што — нельга, што будзе парушэннем закона, а што — не. Нам трэба, маючы гэта на ўвазе, прывыкнуць жыць па законе. Трэба нашых людзей акунуць у глыбіню той заканадаўчай матрыцы, таго аб'ёму заканадаўства, якое існуе ў нашай краіне. ***Прававыя веды павінны стаць асновай, тады будзе стабільнасць у грамадстве.*** Лідары, урад, дэпутаты прыходзяць і сыходзяць, мяняюцца. Канстытуцыя стварае больш-менш стабільную краіну, грамадства і гэтак далей. ***І Канстытуцыю трэба ведаць хоць бы па асноўных палажэннях.*** Гэта каб вы разумелі важнасць пытання», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«УНС БУДЗЕ СТАБІЛІЗАТАРАМ ГРАМАДСТВА»

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што законапраект аб Усебеларускім народным сходзе быў вынесены на народнае абмеркаванне. Гэты дакумент яшчэ раз будзе абмяркоўвацца на ўзроўні Прэзідэнта. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ўважліва сочыць за народнай дыскусіяй і прыйшоў да высновы, што не ўсе людзі зразумелі сутнасць УНС. Часта ўзнікаюць пытанні аб тым, як будуць прадстаўлены працоўныя калектывы, як ад іх будуць выбірацца дэлегаты УНС.

«Матывацыя вельмі простая. ***Усе, хто будзе ўдзельнічаць у рабоце УНС, так ці інакш абіраюцца народам.*** Дэпутаты будуць удзельнічаць — яны абіраюцца народам. Сенатары — па іншай сістэме, але выбіраюцца народам. Члены ўрада там прысутнічаюць, іх прызначае Прэзідэнт, але ён таксама абіраецца народам. І наогул давайце так казаць. Калі не будзе гэтых прафесіяналаў — членаў урада, губернатараў, дэпутатаў, Прэзідэнта — у рабоце УНС, гэта ператворыцца ў гаварыльню. Яны павінны прымаць удзел, абмяркоўваць законапраекты, але ўсе рашэнні будуць прымацца галасаваннем. А галасаваць будуць не толькі дэпутаты, там будуць і прадстаўнікі нашай, як мы мяркуем, грамадзянскай супольнасці: і прафсаюзаў, і ветэранаў, жаночых, маладзёжных арганізацый. А гэта што — не народ?» — растлумачыў Прэзідэнт.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава ў гэтай сувязі ўдакладніла, што працоўным калектывам захавана права вылучаць кандыдатаў у дэпутаты. Яны ў сваю чаргу ўвойдуць у склад УНС у выпадку абрання. Прэзідэнт дадаў, што такім жа чынам будуць выбірацца і члены партый. Ён таксама звярнуў увагу, што могуць быць размовы аб тым, што ва УНС не ўваходзяць працоўныя і сяляне. ***«Я гарантую, што там будуць і рабочыя, і сяляне, і настаўнікі, і ўрачы, і служачыя, і дзяржаўныя служачыя, і вайскоўцы — гэта сто працэнтаў. Мы гэтым самым ахопім усё наша грамадства»***, — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар падкрэсліў самае асноўнае: людзі павінны зразумець, што ва УНС павінны ўваходзіць актыўныя і, галоўнае, прафесійныя людзі. Па яго словах, усе хочуць, каб УНС быў стабілізатарам грамадства, каб не паўтарыўся 2020 год, каб зноў не пачаўся мяцеж. ***«Гэта будзе моцны стабілізатар. Не на вуліцы, а там трэба будзе абмяркоўваць асноўныя праблемы жыцця нашага грамадства... Там павінны быць прафесійныя і актыўныя людзі. Калі там будзе 3-4 чалавекі ад рабочых і сялян, але актыўных, яны заўсёды пункт гледжання данясуць»***, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт лічыць правільным, што законапраект аб Усебеларускім народным сходзе абгаварылі з народам. Новая структура, новы орган улады — людзі павінны ведаць, дзеля чаго ён ствараецца.

НЕЛЬГА ПРЫМЯРАЦЬ НАВАЦЫІ НА ПЕРСАНАЛІІ

Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў, што нормы, навацыі, якія ўносяцца ў заканадаўства, у прыватнасці ў Закон аб Савеце Міністраў, нельга прымяраць на персаналіі. Гэта недапушчальна ні для Прэзідэнта, ні для прэм'ер-міністра, ні для кіраўнікоў палат парламента. «Сёння мы ёсць, можа, мы і заўтра будзем. Але паслязаўтра нас запрашуць не будзе. ***А аснову, стабільнасць мы павінны ствараць для сваіх дзяцей. Ні ў якім разе нельга прымяраць гэтыя законы і законапраекты пад сябе.*** Ні ў якім разе. Ад гэтага трэба адцягнуцца і фарміраваць заканадаўства на будучыню, каб сістэма была ўстойлівая, каб яе ніхто не мог разгайдаць. Залог нашай будучыні. Мы адыдзем ад актыўнага жыцця, але будзем жыць і бачыць, як будзе развівацца краіна. Каб перад дзецьмі не было сорамна», — растлумачыў ён такі падыход.

Аляксандр Лукашэнка арыентуе на тое, што праблемы, якія неабходна вырашаць сёння, нельга пакідаць на будучыню. Па яго словах, праблемы трэба вырашаць па меры паступлення, і вырашаць своечасова тым, хто сёння павінен гэтым займацца. «Дзецям яшчэ дастанецца нямала праблем, якія яны яшчэ павінны будуць вырашыць», — канстатаваў ён.

Таму прывядзенне заканадаўства ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй — вельмі важная для краіны тэма. Беларускі лідар растлумачыў, што пытанняў у гэтай сферы шмат, усе яны няпростыя і патрабуюць самай пільнай увагі, таму і разглядаюцца на самым высокім узроўні.

«СТРУКТУРА ЎРАДА НЕ ПАВІННА ЗАСТАВАЦЦА ЗАСТЫЛАЙ»

Пераходзячы непасрэдна да карэкціроўкі Закона «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь», кіраўнік дзяржавы адзначыў, што за мінулыя гады ўрад набыў каласальны вопыт: пераадоленне крызісных сітуацый і пандэміі, кіраванне эканомікай у гэтых умовах. ***«Я без ілжывай сціпласці скажу: нашы члены ўрада могуць працаваць ва ўрадзе любой краіны, і яны будуць лідарамі. Як у народзе кажуць, яны ўжо гузы набілі так, што могуць кіраваць любымі працэсамі. Гэта каласальны досвед.*** Гэтыя напрацоўкі, паспяхова сфарміраваную практыку абавязкова трэба замацаваць у законе. Я таксама патрабую яшчэ большай ініцыятыўнасці і самастойнасці Савета Міністраў, часам нават смеласці ў прыняцці рашэнняў», — заявіў Прэзідэнт.

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы зноў вярнуўся да пытання цэнаўтварэння. «Урад рэдка бывае, калі можа, выконваючы даручэнне Прэзідэнта, забегчы нашмат наперад. Я на прыкладзе рэгулявання цэн прыводзіў прыклад, калі цэны проста былі адкручаны на 30—40 працэнтаў назад, а можа, і больш па некаторых групах тавараў», — сказаў ён і прывёў у прыклад кампанію «Керамін». Паводле яго слоў, кампанія прыкладна на 30 працэнтаў па асобных назвах керамічнай пліткі знізіла цэны: «Людзі ўсталі ў чаргу. Нарасхват бяруць гэту плітку. І я так падумаў, як эканаміст: ну ад аб'ёму, ад абароту яны атрымаюць яшчэ большы прыбытак. Ці варта было ўзнімаць на завобласную вышыню цэны?» Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што такі прыклад не адзіны, ёсць і іншыя тавары. «Гэта кажа аб тым, што ўрад пайшоў далей. Ён больш справядліва секануў у гэтым плане, і некаторыя вымушаны былі цэны адкруціць, як у нас у народзе кажуць, адступіць назад. Я гэтага не прадбачыў. Але падтрымліваю ў гэтым плане ўрад і спецыялістаў, якія паступілі такім чынам. Гэта добрая дэманстрацыя народу і спецыялістам, эканамістам, што ў нас тлушч быў прыстойны ў цэнах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звярнуўшы ўвагу, што ён не настойваў на адкручванні цэн.

«Не трэба рабіць такога «мы заўтра дабавім» — гэта будзе катастрофа, таму што парушыць ужо тую сістэму, якая пастановай урада выпрацавана. Гэтага рабіць нельга. Гэта добры быў крок урада ў патрэбным кірунку. І гэта я падтрымліваю абсалютна. ***Вось мы ўстаканіліся, цяпер дашліфоўваем на прадпрыемствах, у гандлі і ў вытворчасці ўсе гэтыя працэсы ў плане цэнаўтварэння. Спакойна можам уступаць у новы год і жыць, арыентуючыся на тое, што плануем там каля 8 працэнтаў мець інфляцыі на працягу наступнага года.*** Але не 19 працэнтаў, як мы планавалі сёлета», — рэзюмаваў беларускі лідар.

«УСЁ ПАВІННА БЫЦЬ ПРАПІСАНА ПРОСТА І ЗРАЗУМЕЛА»

Другое пытанне на парадку дня нарады — карэкціроўка Закона «Аб нарматыўных прававых актах». На аснове гэтага дакумента фарміруецца адзіная прававая прастора нашай краіны. «У ім павінны атрымаць развіццё канстытуцыйныя нормы. Але з улікам існуючай абстаноўкі! Яшчэ раз гэта падкрэсліваю!» — паставіў задачу Прэзідэнт. ***«Са з'яўленнем у Канстытуцыі новага органа — Усебеларускага народнага сходу — трэба вызначыць месца яго рашэнняў у сістэме прававых актаў. Гэтыя дакументы па значнасці параўнальныя з рашэннямі з'езда кампартыі ў свой час. Гэта таксама наш вопыт»***, — сказаў Прэзідэнт.

Ён паставіў перад распрацоўшчыкамі канкрэтную задачу — закон павінен змяшчаць адказы на ўсе пытанні па нарматворчасці: пачынаючы ад працэдур падрыхтоўкі і заканчваючы выразным выкладаннем норм.

«САМАЕ ВАЖНАЕ — ЗАХАВАЦЬ ЗБАЛАНСАВАНУЮ СІСТЭМУ»

Аб навацыях законапраектаў далажыў кіраўнік Апарату Савета Міністраў Канстанцін Бурак. Ён звярнуў увагу, што дакументы былі падрыхтаваны ў адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй і практыкай прымянення. Адна з навацый прадугледжвае выключэнне з паўнамоцтваў прэм'ер-міністра функцыі па выкананні абавязкаў Прэзідэнта ў асобных выпадках. Гэтая функцыя ўскладаецца на Старшыню Савета Рэспублікі.

Прэзідэнт удакладніў, што ўнесці гэтую папраўку ў Канстытуцыю — яго ініцыятыва. У выпадку адыходу ад улады дзеючага Прэзідэнта і пераходу яго паўнамоцтваў да прэм'ер-міністра, як гэта было раней, у руках прэм'ер-міністра былі б рычагі для кіравання фінансавымі інструментамі, парламентам, судовай сістэмай, а таксама і выканаўчай галіной улады. «Гэта, напэўна, не зусім правільна. Павінны быць процівагі. Уявіце: прэм'ер-міністр у выпадку адыходу Прэзідэнта праводзіць прэзідэнцкія выбары (ён павінен арганізаваць як выконваючы абавязкі Прэзідэнта). Бюджэт, эканоміка, фінансы і іншае аказваюцца ў адных руках. Так? Так. Вынік амаль гарантаваны пры любой дэмакратыі... Таму было прынята рашэнне, што ў такой сітуацыі выконваць абавязкі будзе Старшыня Савета Рэспублікі. Прэм'ер-міністр застаецца кіраваць эканомікай», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што ў прынцыпе гэтага рашэння не ўлічваліся персаналіі тых, хто зараз займае адпаведныя пасады. Самае важнае — захаваць збалансаваную сістэму. Па словах Прэзідэнта, гэта абсалютна дэмакратычны крок: «Тое, што арганізуе выбары Старшыня Савета Рэспублікі, — больш дэмакратычна. Калі гэта будзе сумленна, асабліва пры выбарах галоўнай асобы, тады і людзі будуць разумець гэта. Таму што на гэтым (вы бачыце) раскручваюцца ўсе пратэсты, санкцыі, мяцяжы і іншае. Я выходзіў з гэтага».

«РАШЭННІ УНС ПАВІННЫ БЫЦЬ УНІКАЛЬНЫМІ»

Таксама сярод навацый — нормы, якія рэгламентуюць пытанні ўзаемадзеяння Савета Міністраў і УНС. Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз падкрэсліў, што гэта вельмі важна, паколькі новы орган дзяржаўнай улады трэба ўманціраваць у структуру дзяржавы. Ён вобразна параўнаў гэта з тым, як новы чалавек становіцца ў строй і так ці інакш закранае плячыма людзей побач. «Тут трэба зрабіць так, каб УНС уманціраваць у гэтую сістэму, нікога не чапляючы ні левым, ні правым плячом», — заўважыў ён.

Канстанцін Бурак адзначыў, што менавіта з гэтай мэтай праз усе артыкулы, дзе гэта неабходна, праходзіць палажэнне аб значнасці, юрыдычнай сіле рашэнняў УНС. Напрыклад, устанаўліваецца абавязак прэм'ер-міністра штогод інфармаваць УНС аб выкананні праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця. А Прэзідэнт яшчэ раз нагадаў аб ключавой ролі сходу і абавязковасці выканання яго рашэнняў. ***«УНС павінен прымаць адно-два рашэнні, груба кажучы. Але яно падлягае выкананню ўсімі. Не дай бог вайна... Прынята рашэнне Усебеларускім народным сходам — і ўсе сталі. Гэта мелася на ўвазе. Рашэнні УНС павінны быць унікальнымі. І павінны прымацца па выключна нямногіх пытаннях. Ні ў якім разе не ўлазіць у кампетэнцыю Прэзідэнта і іншых органаў улады»***, — растлумачыў ён. А іншыя органы ўлады і выпадку прыняцця рашэнняў УНС павінны выбудоўвацца адзін за адным і дзейнічаць. Прэзідэнт прызнаўся, што хвалюецца, каб менавіта гэта было прапісана і па духу, і па законе.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга Чупрыс адказала, што менавіта такі сэнс закладзены ў законапраекце аб нарматыўных прававых актах адносна рашэнняў УНС. У іерархіі дакументаў па важнасці яны ідуць за Канстытуцыяй, законамі аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, рашэннямі рэспубліканскіх рэферэндумаў. Яна падкрэсліла, што рашэннямі УНС можна адмяніць любое рашэнне любога органа, акрамя судовых рашэнняў, адпаведна ў гэтым іх значная юрыдычная сіла.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, чаму ён удзяляе такую пільную ўвагу фарміраванню заканадаўчай базы ў развіцё абноўленай Канстытуцыі. «Мы, хто сядзіць за сталом, павінны гэта ўсё ўтрэсці, устаканіць. Прыйдуць новыя людзі на гэта гатовае, якое мы павінны стварыць. ***Гэта не жарт — кіраванне грамадствам, дзяржавай, сацыяльна-эканамічнымі працэсамі і захаванне суверэнітэту і незалежнасці ў цяперашні час. У гэтай частцы галоўная задача дзеючага Прэзідэнта, гэта значыць мяне, — каб мы гэта ўсё ўтрэслі. Таму я і ўдзяляю такую ўвагу гэтым нарматыўным прававым актам у развіцці Канстытуцыі»***, — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што бачыць сваёй задачай пакінуць новаму пакаленню ў спадчыну нармальную сістэму кіравання грамадствам і дзяржавай. «Вось у чым сэнс. Колькі для гэтага часу трэба дзейнаму Прэзідэнту і ўсім нам? Колькі трэба, столькі і будзе», — заявіў беларускі лідар.

На нарадзе таксама былі абмеркаваны іншыя палажэнні законапраектаў: паўнамоцтвы Савета Міністраў. На выніках дыскусій прынята рашэнне яшчэ раз вярнуцца да пытання юрыдычных фармулёвак, якія датычацца ўнікальнага статусу рашэнняў Усебеларускага народнага сходу, каб яны забяспечылі ім дастойнае месца ў іерархіі нарматыўных прававых актаў у адпаведнасці з тымі патрабаваннямі і задачамі, якія агучыў на нарадзе кіраўнік дзяржавы.

Валерыя СЦЯЦКО.

ПА ДАРОГАХ КРАІНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У цэлым жа па выніках года чакаецца прывядзенне ў добры эксплуатацыйны стан больш за 700 кіламетраў аўтакамунікацый і 2500 пагонных метраў маставых збудаванняў рэспубліканскай сеткі, звыш 1,5 тысячы кіламетраў мясцовых дарог і 1080 пагонных метраў мастоў на іх.

Мастам Мінтранс аддае асаблівую ўвагу, паколькі ад іх стану залежыць якасць маршрутнай сеткі ў цэлым. Таму дыягностыка і абследаванне такіх аб'ектаў праводзяцца рэгулярна. У праграму «Дарогі Беларусі» ўвайшлі 32 масты, якія патрабуюць першачарговага рамонту. З улікам выдзеленых сродкаў сёння ажыццяўляюцца іх аднаўленне і рэканструкцыя. Частка дадатковага фінансавання пойдзе на абнаўленне 77 мастоў (35 — рэспубліканскай сеткі, 42 — мясцовай). Такім чынам, выдзяленне дадатковага фінансавання не толькі дазволіць замясціць недаатрыманыя рэсурсы, але і выканаць рамонтна-будаўнічыя работы на беларускіх дарогах краіны ў поўным аб'ёме.

Сёлета плануецца ўвесці ў эксплуатацыю мост праз раку Заходняя Дзвіна на пад'ездзе да Наваполацка, абход гарадскога пасёлка Мір працягласцю 4,6 кіламетра. Заканчваецца будаўніцтва паўднёва-заходняга абходу Магілёва даўжынёй 11,5 кіламетра. Налета плануецца пачатак рэканструкцыі дарогі Полацк — Лепель працягласцю 61,5 кіламетра.

КІТАЙСКІЯ КРЭДЫТЫ ЗАМЕСТ ЕЎРАПЕЙСКІХ РЭСУРСАЎ

Нягледзячы на атрыманне сродкаў з бюджэту, Міністэрства транспарту не адмаўляецца ад супрацоўніцтва і з іншымі інвестарамі, разглядаючы розныя варыянты, у тым ліку дзяржаўна-прыватнае партнёрства. У прыватнасці, на прынцыпах апошняга плануецца рэалізацыя праекта па рэканструкцыі трасы М10. На дадзены момант аб'яўлены трэці, завяршальны этап конкурсу, вынікі якога шмат у чым вызначаць перспектывы рэалізацыі праекта.

Што датычыцца пошуку крыніц дадатковага фінансавання, тут разглядаюцца розныя шляхі вырашэння праблемы. Напрыклад, Мінтранс цяпер прапрацоўвае пытанне па прыцягненні крэдытных сродкаў Кітая для рэканструкцыі ўчастка Р46 Лепель — Полацк — мяжа РФ (Юхавічы). Падобным чынам будзе вырашацца і крэдытаванне рэканструкцыі трасы М3 Мінск — Віцебск.

УВАГІ ПАТРАБУЮЦЬ І МЯСЦОВЫЯ ДАРОГІ

Як праводзяцца рамонт і рэканструкцыя сеткі мясцовых дарог, можна ўбачыць на прыкладзе цэнтральнага рэгіёна краіны. Як адзначыў **начальнік аддзела ўтрымання дарожнай сеткі і бяспекі дарожнага руху «Мінскаблдарбуд» Валянцін ВОЎЧАНКА**, на балансе прадпрыемства знаходзіцца 16,2 тысячы кіламетраў аўтадарог агульнага карыстання, з якіх толькі 8,5 тысячы забяспечаны цвёрдым пакрыццём (асфальтабетон, цэментабетон, чорны шчэбень). Па выніках вясновага камісійнага агляду ўстаноўлена, што 2,6 тысячы кіламетраў мясцовых дарог на тэрыторыі вобласці знаходзяцца ў неналежным стане і патрабуюць першачарговага і неадкладнага рамонту.

На пытанне аб планаваным узвядзенні цвёрдага пакрыцця на ўсіх неасфальтаваных участках мясцовых дарог прадстаўнік абласнога прадпрыемства адказаў, што існуе праграма пераходу з гравійкі на асфальтабетон. Але з-за абмежаванасці сродкаў казаць аб ступені рэалізацыі праекта пакуль не выпадае. Перавод аднаго кіламетра дарогі з гравійнага на асфальтабетоннае пакрыццё абыходзіцца ў 300 тысяч рублёў. Таму ў прыярытэтах — рамонт аварыйных участкаў дарог. Цяпер уся дзейнасць ведамства накіравана на прывядзенне ў адпаведнасць з дзеючымі нормамі перш за ўсё асфальтаваных участкаў з высокай інтэнсіўнасцю руху транспарту і тых, паблізу якіх размешчана шмат населеных пунктаў.

БЕНЗІН, ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ, ГАЗ, А ПОТЫМ І ВАДАРОД?

Не менш важныя і транспартныя сродкі, якія ездзяць па дарогах нашай краіны. У апошнія гады ўсё больш увагі ўдзяляецца электратранспарту, яго распрацоўкай і вытворчасцю займаюцца найбуйнейшыя беларускія прадпрыемствы. Так, у наменклатуры ўсёй тэхнікі, якую выпускае Мінскі аўтамабільны завод, ёсць мадэлі электрычнага транспарту.

Галоўны канструктар — начальнік упраўлення галоўнага канструктара аўтаматызаваных сістэм, тэлематыкі і мехатронікі МАЗа Андрэй САЎЧЫЦ адзначыў, што ў цяперашні час у наменклатуры выпусканай тэхнікі ёсць тыпавыя мадэлі электрычнага транспарту: тралейбус, у тым ліку з аўтаномным ходам, электробус, грузавы аўтамабіль да 12 тон поўнай масай у гатовым выкананні. Распрацаваныя тэхнічныя рашэнні спецыялісты завода могуць пераносіць на абсалютна любую мадэль тэхнікі, гэта значыць, любы дызельны варыянт з электрычным прывадам прапанаваць рынку ў кароткія тэрміны.

Сумесна з іншымі прадпрыемствамі краіны і Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі на МАЗе метадычна вядзецца работа па лакалізацыі кампанентаў. Так, з дапамогай «Магілёўліфтмаша» асвойваўся электрычны цягавы рухавік. Цяпер на заводзе займаюцца высакавольтнай камутацыяй і назапашвальнікамі энергіі. Адна з галоўных праблем, якія перашкаджаюць развіццю электратранспарту, — значна ўзрослы кошт літыевых батарэй. Таму на МАЗе разглядаюць альтэрнатыўныя варыянты.

Андрэй Саўчыц адзначыў, што ўжо сёлета серыйныя варыянты электратранспарту могуць быць прадстаўлены ў масавую вытворчасць. Налета ж — узмоцніцца ступень лакалізацыі кампанентаў, будзе атрыманы цалкам беларускі электратранспарт.

У той жа час разглядаюцца і альтэрнатыўныя віды паліва. **Намеснік галоўнага канструктара МАЗа па аўтамабільнай тэхніцы Мікалай ЛАКОТКА** адзначыў, што скарачэнне сусветных запасаў нафты і рост цэн на нафтапрадукты стымулявалі пошук альтэрнатыўных відаў паліва.

Вынікам стала выкарыстанне на транспарце прыроднага газу: ён у два разы таннейшы, чым дызель, а ў прыродзе існуе ў выглядзе практычна гатовага паліва. Прыродны газ цалкам адпавядае ўсім патрабаванням, якія прад'яўляюцца да паліва для аўтамабіляў. Ён утварае мінімальную колькасць таксічных рэчываў, змяшчае мінімум злучэнняў, якія выклікаюць карозію рухавіка аўтамабіля, валодае добрым сумесеўтварэннем з рухавіком, мае высокі актанавы лік і мінімальнае ўтрыманне смалістых рэчываў, што прадухіляе нагараўтварэнне.

Паміж кіраўніцтвам Беларусі і «Газпрамам» падпісаны пратакол намераў аб пашырэнні і ўжыванні прыроднага газу ў якасці маторнага паліва. Распрацаваны мерапрыемствы па пашырэнні будаўніцтва розных аўтамабільных газанапаўняльных кампрэсарных станцый і па газіфікацыі аўтатранспарту. МАЗ прапануе цэлую лінейку аўтамабіляў, якія працуюць на газаматорным паліве. Найбольш запатрабаваны камунальны транспарт з рознай колавай формулай, паўнапрывадная аўтатэхніка і пасажырская тэхніка. Перавага МАЗа ў тым, што ён прапануе гатовы прадукт газабаланнага абсталявання самай высокай якасці, якое мае ўсе неабходныя сертыфікаты. Акрамя работы на сціснутым прыродным газе, МАЗ вядзе яшчэ адзін перспектыўны напрамак — выкарыстанне ў якасці паліва звадкаванага газу, які захоўваецца пры мінусавай тэмпературы.

У сціснутага газу, а тым больш звадкаванага — вельмі вялікія перспектывы ў якасці аўтамабільнага паліва, упэўнены спецыяліст.

— Уся тэхніка, якая выпускаецца нашым прадпрыемствам, адпавядае 5-му экалагічнаму класу. МАЗ мае вопыт праектавання электрамабіляў, аўто на газаматорным паліве, так што на чарзе, наступным этапам — вадародны аўтамабіль, — падкрэсліў Мікалай Лакотка.

Сяргей КУРКАЧ.

Надвор'е

ЦЁПЛЫ ПЯРЭДАДЗЕНЬ ЗІМЫ

У сярэдзіне лістапада днём да 13 цяпла, ды і ноччу з плюсам

Здавалася б, апошні месяц восені павінен сігналізаваць аб блізкай зіме. У былыя гады ў гэты час тэмпература паветра ўсё часцей становіцца адмоўнай, а ападкі выпадаюць у выглядзе снегу і мокрага снегу. Цяперашні лістапад прыняў эстафету ў цёплага кастрычніка і працягвае сваё шэсце не менш цёплым і сырым надвор'ем. Сярэдняя тэмпература паветра за першыя 7 дзён месяца на большай частцы тэрыторыі краіны вышэйшая за норму. Як паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, на гэтым тыдні ў нашай краіне працягне захоўвацца не па сезоне цёплае надвор'е з тэмпературным фонам, які пераважна на 3—5 градусаў вышэйшы за кліматычную норму, пры гэтым ападкаў чакаецца няшмат і размяркоўвацца па тэрыторыі краіны яны будуць нераўнамерна.

А ў сераду днём будзе пераважна без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 8 да 13 градусаў цяпла.

Дажджы «прачнуцца» ў чацвер. У гэтыя суткі ноччу па поўначы, раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца дажджы. Месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 2 да плюс 7 градусаў, а ўдзень — ад плюс 6 да плюс 13 градусаў.

У пятніцу, у светлы час сутак, зноў будзе суха. Праўда, у гэты дзень ноччу і раніцай у многіх раёнах краіны прагназуюцца дажджы. А вось днём пераважна без ападкаў. Месцамі слабы туман. Ўначы тэмпература паветра не перавысіць плюс 3—8 градусаў. Днём чакаецца плюс 7—12 градусаў са знакам плюс.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу будзе пераважна без ападкаў, толькі месцамі па паўночным усходзе краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 2—9 градусаў, удзень — 7—13 цяпла.

Між іншым, сярэдняя па Беларусі тэмпература паветра за кастрычнік 2022 года склала плюс 8,9 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 2,1 градуса. Па ўсёй тэрыторыі краіны адзначалася станоўчая анамалія тэмпературы паветра, змянялася ў асноўным у межах ад 1 да 3 градусаў у напрамку з паўночнага ўсходу і ўсходу на захад. Сярэдняя тэмпература першай дэкады была блізкая да нормы, другая і трэцяя дэкады былі цёплымі са станоўчай анамаліяй, роўнай 1,7 і 4,2 градуса адпаведна. Тэмпература паветра днём на працягу месяца ў асноўным складала плюс 7—20 градусаў. Тэмпература паветра ўначы на працягу месяца знаходзілася ў асноўным у межах плюс 1—12 градусаў. У самыя халодныя ночы тэмпература паветра месцамі апускалася да адмоўных значэнняў.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ФАО знізіла прагноз сусветнага збору збожжа

Харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН (ФАО) у лістападзе знізіла ў параўнанні з кастрычнікам прагноз сусветнай вытворчасці збожжа сёлета на 4,9 мільёна тон — да 2,764 млрд тон. Аб гэтым паведамляецца ў справаздачы арганізацыі. Новы паказчык на 1,8 працэнта ніжэйшы за мінулагодні збор. «Асноўная доля перагляду датычыцца пшаніцы, аднак крыху зніжаны і прагноз сусветнай вытворчасці фуражных збожжавых», — адзначаецца ў дакументе. Так, ацэнка збору пшаніцы стала меншай на 3,4 млн тон і складае 783,8 млн тон. Як тлумачаць эксперты, перагляд прагнозу па зборы пшаніцы «амаль поўнасцю абумоўлены паказчыкамі вытворчасці ў ЗША — зніжэннем ураджайнасці і скарачэннем уборачных плошчаў». Па астатніх краінах-вытворцах, дзе завяршаецца ўборка, прагнозы не змяніліся. Ацэнка збору фуражных збожжавых зніжана на 1,3 млн тон і складае 1,467 млрд тон, што на 2,8 працэнта менш, чым летась. «Гэта першае за апошнія чатыры гады зніжэнне вытворчасці», — адзначаецца ў справаздачы.

У Еўропе сёлета з-за гарачыні памерла каля 15 тысяч чалавек

Так гаворыцца ў заяве дырэктара бюро Ханса Клюге. У дакументе ўдакладняецца, што за лета работнікі сферы аховы здароўя, у прыватнасці, зарэгістравалі каля 4,5 тысячы смерцяў у Германіі, прыблізна 4 тыс. у Іспаніі, больш за 3,2 тыс. лятальных выпадкаў у Вялікабрытаніі і больш за тысячу ў Партугаліі. Адзначаецца, што паказчык смяротнасці з-за спёкі можа ўзрасці. Паводле звестак СААЗ, высокая тэмпература паветра можа пагоршыць хранічныя захворванні, уключаючы сардэчна-сасудзістыя, рэспіраторныя, а таксама ўскладненні, звязаныя з дыябетам. Клюге нагадаў, што тэмпература ў Еўропе значна павысілася ў перыяд з 1961-га да 2021-га. За мінулыя 50 гадоў у рэгіёне з-за экстрэмальных тэмператур загінула больш як 148 тысяч чалавек.

У Германіі заапаркі з-за энергакрызісу збіраюць ахвяраванні і раздаюць жывёлін

Нямецкія заапаркі з-за высокіх цэн на электрычнасць вымушаныя шукаць спонсараў, збіраць ахвяраванні, каб аплаціць рахункі і забяспечыць цяплом насельнікаў, але ёсць тыя, якія ўжо не спраўляюцца і аддаюць жывёлін новым уладальнікам. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны». Чацвёрты найстарэйшы нямецкі заапарк у Дрэздэне на фоне цяперашняга крызісу пацярпеў больш за ўсё. З-за немагчымасці аплаціць рахункі за ацяпленне кіраўніцтва прыняло рашэнне закрыць тэрарыум і перадаць 10 відаў рэптылій, а таксама каля 25 відаў рыб новым уладальнікам, якія «знаходзяцца не толькі ў Германіі, але і ў іншых краінах ЕС». Два сталічныя заапаркі і Берлінскі акварыум, у якіх утрымліваецца звыш 30 тысяч жывёлін, перад пачаткам зімы аб'явілі аб зборы ахвяраванняў з-за вялізных рахункаў за электраэнергію. Адзін з самых буйных і найстарэйшых у Еўропе заапаркаў у нямецкім Гановеры плануе адмовіцца ад знадворнага асвятлення і падсветкі будынкаў. Меры эканоміі прымаюць і ў Нюрнбергскім заапарку.

АСЦЯРОЖНА, ЦЫГАРЭТА!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прычына ўсё тая ж — неасцярожнае абыходжанне з агнём падчас курэння. Агонь пашкодзіў падаконнік і матрац. Сцены і столь па ўсёй плошчы будынка былі закураны. Грамадзянін, па віне якога адбылося надзвычайнае здарэнне, своечасова прачнуўся — лёс падарыў яму другі шанц.

У кашулі нарадзіўся і гаспадар аднаго з дамоў у аграгарадку Дзівін, што ў Кобрынскім раёне. Паведамленне аб пажары паступіла па радыёстанцыі ад начальніка варты пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 3 гэтага населенага пункта. Як высветлілася, у хаце, дзе адбылося ўзгаранне, спрацаваў аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Грамадзянін, які праходзіў побач, пачуў гук, што сігналізуе аб небяспецы, падышоў бліжэй і ўбачыў задымленне. Дзякуючы пільнасці гэтага чалавека супрацоўнікі МНС аператыўна выехалі да месца здарэння. Адкрытага агню ў памяшканні ратавальнікі не выявілі, затое дыму было столькі, што без спецыяльнага абмундзіравання знаходзіцца ў доме было немагчыма. Не дзіва, што гаспадара вынеслі з хаты ў беспрытомным стане. З тэрмічнымі апёкамі цела і атручэннем прадуктамі гарэння пенсіянера шпіталізавалі. Папярэдняя версія пажару — зноў непатушаная цыгарэта.

Менавіта на гэтай прычыне надзвычайнае здарэнне адбылося і ў Віцебску. Ратавальнікі аператыўна адрэагавалі на паведамленне аб задымленні ў адным з пад'ездаў двухпавярховага дома па вуліцы К. Маркса.

Наступствы нядаўняга пажару на Магілёўшчыне.

— Калі мы прыбылі да месца пажару, па знешніх прыкметах убачылі, што з кватэры на першым паверсе ідзе дым, — расказаў **ратавальнік Юрый МАКАРЧУК**. — Неадкладна сфарміраваўшы звяно газадымаахоўнай службы, мы з Алегам Пятровым і Яўгенам Каліненкам зайшлі ў кватэру, у якой было вельмі шчыльнае задымленне. У калідоры я заўважыў мужчыну на калясцы, ён быў у прытомнасці і клікаў на дапамогу. Мы адразу ж выцягнулі яго на свежае паветра, спытаўшы, ці ёсць у кватэры яшчэ людзі. Мужчына паведаміў, што ў пакоі знаходзіцца яго дзядзька. Дваіх калег я пакінуў з пацярпелым, а сам разам з Максімам Чарняўскім адправіўся паўторна на абследаваць кватэру. У падпаленым пакоі на ложку мы знайшлі яшчэ аднаго чалавека, які знаходзіўся без прытомнасці, пасля чаго неадкладна вынеслі яго на свежае паветра, дзе правялі першачарговыя рэанімацыйныя мерапрыемствы да прыезду хуткай дапамогі.

Пажар быў паспяхова ліквідаваны. Аднак хэпі-эндам усё скончылася толькі для аднаго з мужчын. Другі, якога ў непрытомным стане ратавальнікі выносілі з памяшкання, праз некалькі дзён памёр у бальніцы.

НЕ КУРЫЦЕ Ў ХАЦЕ!

У Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях за 10 месяцаў бягучага года зафіксавана 2097 пажараў, якія адбыліся па прычыне неасцярожнага абыходжання з агнём. У выніку атручвання прадуктамі гарэння на пажарах загінулі 499 чалавек, 389 з іх пазбавілася жыцця менавіта з-за таго, што неасцярожна абыходзіліся з агнём.

Учора ў краіне стартавала рэспубліканская акцыя «Не прапальвай сваё жыццё!». Яе мэта — папярэджанне пажараў і гібелі людзей ад іх па прычыне неасцярожнага абыходжання з агнём пры курэнні. На розных пляцоўках перад рознабаковай аўдыторыяй ратавальнікі яшчэ раз нагадаюць, як не дапусціць пажараў і што рабіць, калі ўзгарання ўсё-такі не ўдалося пазбегнуць.

— Не грэбуйце сваёй бяспекай, — звяртае ўвагу грамадзян **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ**. — Выконвайце правілы пажарнай бяспекі ў побыце і на працоўным месцы, не дапускайце курэння ў неўстаноўленых месцах, у тым ліку ў жылых памяшканнях. Ніколі не курыце ў ложку або ў крэсле: стомлены чалавек або той, хто выпіў, не заўсёды можа кантраляваць свае дзеянні.

Нельга дапускаць курэння каля лёгкаўзгаральных і гаручых вадкасцяў. Катэгарычна забараняецца выкідваць непатушаныя цыгарэты ці запалкі з вокнаў ці балконаў — яны могуць трапіць да суседзяў. Невыпадкова, сыходзячы з кватэры, рэкамендуецца зачыняць вокны і балконы. Акрамя таго, варта сачыць за тым, каб запалкі і цыгарэты пасля выкарыстання былі цалкам патушаны. Памятайце: адна непатушаная цыгарэта можа загубіць не адно чалавечае жыццё! Лепш за ўсё, вядома, не курыць, а калі і курыць, то рабіць гэта на вуліцы.

І калі пазбавіцца ад шкоднай звычкі вы яшчэ не гатовы, то падстрахуйце сябе і сваю сям'ю — устанавіце дома (у кожным жылым пакоі) аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Гэты даступны кожнаму прыбор, які абсалютна не перашкаджае ў побыце, здольны на многае — выявіць узгаранне на ранняй стадыі і апавясціць аб пажары, нават разбудзіўшы чалавека ўначы. Таму не эканомце на апавяшчальніках: даражэй за жыццё больш нічога няма.

Вераніка КАНЮТА.

Класныя навіны

ДЗІЦЯЧЫ САДОК — У КРОКАВАЙ ДАСТУПНАСЦІ

Так, у новым жылым комплексе Першамайскага раёна сталіцы ў суседстве з паркам Чалюскінцаў урачыста адкрылі камфортны дзіцячы садок № 579, разлічаны на 90 месцаў, а ў Заводскім раёне на вуліцы Іркуцкай адбылося ўрачыстае адкрыццё пасля капітальнага рамонту дзіцячага садка № 477, разлічанага на 186 месцаў.

На цырымоніі адкрыцця дзіцячага садка № 579 **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ** падкрэсліў: «Сёння наша дзяржава надае вельмі сур'ёзную ўвагу падрастаючаму пакаленню. І дашкольныя ўстановы, і прафесіяналы, якія ў іх працуюць, — шмат у чым адыгрываюць фундаментальную ролю ў яго выхаванні. Бо ад педагогаў залежыць, якія дзеці прыйдуць у нашу школу. Аб'ект, што знаходзіцца ў крокавай даступнасці, — сапраўдны падарунак, пакалькі бацькі, малыя, фактычна не выходзячы з дому, змогуць наведваць садок з цудоўнай сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базай і кваліфікаванымі педагогамі».

Дзіцячы садок размяшчаецца на першых двух паверхах шматпавярховіка ў шматкватэрным жылым доме за станцыяй «Заслонава» Дзіцячай чыгункі.

Варта адзначыць, што праект дашкольнай установы аказаўся дастаткова складаным. Няпроста было ўзгадніць суседства жылых памяшканняў і дзіцячай установы. Гэта і асаблівасці пракладкі інжынерных сетак, і забеспячэнне належнага ўзроўню бяспекі, шумаізаляцыі.

Але плюсоў ва збудаванага ў жылы дом садка нямала. Па-першае, гэта зручна для мінчан, калі дашкольная ўстанова знаходзіцца ў тваім жа доме. Па-другое, не занятая дадатковая гарадская тэрыторыя, бо адшукаць свабодныя землі ва ўжо існуючай забудове ў цэнтры сталіцы — няпростая задача.

Ва ўрачыстым адкрыцці дзіцячага садка № 477 у Паўночным пасёлку Заводскага раёна ўзяў удзел **намеснік міністра адукацыі Сяргей РУДЫ**.

У прывітальным слове ён адзначыў: «Дашкольная адукацыя нашай краіны — адна з найлепшых у свеце. Мяркуйце самі: сёлета ў Беларусі ў эксплуатацыю ўводзяцца адразу 15 дзіцячых садкоў, пабудаваных з нуля. Створаныя ўмовы дазволяць вучыць і выхоўваць нашых малых. Думаю, дзіцячы садок № 477 таксама вырасціць новых навукоўцаў, рабочых, выкладчыкаў».

У выніку выкананага рамонту сёння ў двухпавярховым будынку з'явіліся яркія гульнявыя пакоі, прасторныя музычная і спартыўная залы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Адпачынак з карысцю

НА БЕЛАРУСКІЯ САНАТОРЫІ ЗАХОЎВАЕЦЦА ВЫСОКІ ПОПЫТ

На Новы год ужо забраніравана 60 працэнтаў нумароў

Гэтай восенню адзначаецца павышаны попыт на санаторна-курортнае лячэнне. На навагоднія святы ўжо забраніравана каля 60 працэнтаў месцаў. Ёсць цікавасць да такога адпачынку і на наступны год — на студзень браніраванне складае каля 35 працэнтаў. Хто сёння выбірае беларускія здраўніцы, з чым звязана цікавасць да іх з боку замежных гасцей і расіян і колькі будзе каштаваць навагодні банкет у санаторыі, расказаў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.

ЗАПАЎНЯЛЬНАСЦЬ РАСЦЕ НАВАТ У МІЖСЕЗОННЕ

У параўнанні з мінулымі гадамі ў гэта міжсезонне запаўняльнасць беларускіх здраўніц перавышае сярэднямесячную ў такі перыяд і складае больш за 80 %. За 9 месяцаў запаўняльнасць склала 81,4 % (летась за аналагічны перыяд — 76,8 %).

Што датычыцца ў цэлым вынікаў работы за 9 месяцаў гэтага года, то попыт стабільна высокі і пастаянна расце, адзначае Генадзь Балбатоўскі. Па выніках года мяркуецца выйсці на паказчыкі дапандэмічнага 2019-га. За 9 месяцаў больш за 1,1 мільёна чалавек прайшлі лячэнне і аздараўленне (у 2019-м — каля 1,3 мільёна). Прагноз па запаўняльнасці на наступныя перыяды таксама аптымістычны: на лістапад забраніравана 88 % месцаў, на снежань — 60 %, на студзень 2023-га — больш за 35 %.

НАВЕДВАЛЬНІКІ З ПАЎСОТНІ КРАІН

Экспарт паслуг за 9 месяцаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года вырас на 72 % і перавысіў 186 мільёнаў рублёў. Колькасць замежнікаў, якія прыехалі ў нашы санаторыі, павялічылася на 44 %, а гэта больш чым 142 тысячы чалавек.

— З замежнікаў найбольшую частку складаюць грамадзяне Расіі. Але ў цэлым геаграфія наведвальнікаў шырокая — больш за 50 краін. Нягледзячы на несяброўскую рыторыку балтыйскіх краін, у нас штодзень знаходзіцца больш за 100 грамадзян з Эстоніі, Латвіі і Літвы. На канец мінулага тыдня гэта лічба перавысіла нават 200 чалавек. Сёння нашы найбліжэйшыя суседзі з задавальненнем карыстаюцца магчымасцю і прыязджаюць да нас, — падкрэсліў Генадзь Балбатоўскі.

Што датычыцца санкцыйнага ціску, то тут сураз моўца дадаў, што, безумоўна, ён адбіваецца на суадносінах замежных грамадзян.

— Сёння мы бачым змяншэнне замежнікаў і не дасягнем лічбы 2019 года, калі іх прыязджала больш за 200 тысяч чалавек. Аднак мы развілі свой унутраны турызм. Па колькасці пуцёвак, рэалізаваных сёлета юрыдычным і фізічным асобам, мы выйдзем на тыя ж лічбы 2019 года. Толькі суадносіны будуць не 40 % замежнікаў і 60 % беларусаў, а 75 % суайчыннікаў і 25 % гасцей з замежжа.

Мінулы тыдзень, на які прыпалі асенніе канікулы школьнікаў, санаторыі працавалі з максімальнай загрузкай. Запаўняльнасць склада ла больш за 90 %. У лагерах розных тыпаў прайшло аздараўленне больш за 62 тысячы дзяцей. На гэтыя мэты з бюджэту было выдаткавана больш за 1,7 мільёна рублёў. Попыт цалкам задаволены ў адпаведнасці з заяўкамі.

Цяпер у Мінскай вобласці ў лагеры «Дубрава» рэалізоўваецца гуманітарны праект па аздараўленні дзяцей Данбаса. Ён праводзіцца пад эгідай дабрачыннага фонду Аляксея Талая пры ўдзеле «Беларускалія» і іншых арганізацый. У апошні заезд аздараўленне прайшло каля 300 дзяцей, да канца гэтага года праект працягнецца.

Трэба сказаць, што кожны год Беларусь рэалізоўвае аналагічныя праекты. Сёлета, у прыватнасці, у нашай краіне адпачывалі дзеці з Сірыі, Узбекістана і традыцыйна з Расіі. Гэта практыка працягнецца і ў наступным годзе.

КОЛЬКІ КАШТУЕ НАВАГОДНІ БАНКЕТ?

Сярэдні кошт пуцёвак у свабоднай рэалізацыі сёлета склаў 76 рублёў, калі браць стандартны двухмесны нумар. Адзін дзень у санаторыі ў перыяд навагодніх свят (з 25 снежня да 7 студзеня) складзе каля 93 рублёў. Кошт навагоднягa банкета — каля 200 рублёў. Плануецца, што ў санаторыях Новы год адзначыць каля 22 тысяч чалавек, з іх палова — замежнікі, пераважна расіяне.

Нагадаем, што пакуль 40 % месцаў застаецца свабоднымі і магчымасць набыць пуцёўкі яшчэ ёсць. Акрамя медыцынскага складніка адпачывальнікам у гэты перыяд прапануюць шэраг культурна-масавых і забаўляльных мерапрыемстваў.

— Цэны застаюцца нязменнымі, прэйскуранты былі зацверджаны, зараз ідзе браніраванне і продаж па ўстаноўленых да адпаведнага распараджэння Прэзідэнта цэнах, — падкрэсліў Генадзь Балбатоўскі. — Ні пра якое павелічэнне цэн размовы ісці не можа, рэспубліканскі цэнтр кантралюе гэта пытанне выбарачным маніторынгам.

Як адзначыў дырэктар Цэнтра, унёсак турызму ў ВУП краіны адстае ад еўрапейскага ўзроўню, таму стаіць задача павялічыць турысцкі патэнцыял. Пры наяўнасці інвестараў ім будуць прапанаваны пляцоўкі для будаўніцтва новых санаторна-аздараўленчых устаноў, пакалькі пералік месцаў з разведанымі крыніцамі мінеральных вод, грязевых радовішчаў дастаткова шырокі, не кажучы пра эстэтычны і прыродны складнікі. Кожны рэгіён працуе над гэтым пытаннем.

Эксперт дадаў, што санаторыі штодзень ўкараняюць новыя паслугі, валодаюць самай сучаснай медыцынскай апаратурай, а ў методыках выкарыстоўваюцца ўнікальныя прыродныя лячэбныя фактары, што з году ў год прыцягвае новых аматараў да такога віду адпачынку.

Алена КРАВЕЦ.

Анонс

Сустрэча з героямі «Стваральнікаў»

Зіновій ПРЫГОДЗІЧ выданнем кнігі «Созидатели. Книга 3», якая сёлета ўбачыла свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура», завяршыў трылогію, складзеную з гутарак-партрэтаў з дзеячамі беларускай культуры, беларускай літаратуры. Сустрэчы, якія прадстаўлены ў трохтомніку са знакавай назвай — «Стваральнікі», заснаваны на ўражаннях, журналісцкіх інтэрв'ю на працягу значнага адрэзка часу.

У першым томе суразмоўцамі дасведчанага публіцыста, пісьменніка выступаюць Васіль Быкаў, Наталля Гайда, Міхась Дрынеўскі, Аляксей Дударэў, Мікалай Яроменка, Марыя Захарэвіч, Леанід Левін, Ігар Лучанок, Адам Мальдзіс, Іван Міско, Міхась Міцкевіч, Генадзь Аўсяннікаў, Георгій Паплаўскі, Міхаіл Фінберг. У другім — Валянціна Гаявая, Аксана Волкава, Алег Елісеенкаў, Міхаіл Казінец, Міхаіл Савіцкі, Янка Сіпакоў, Іван Шамякін, Іван Юркін, Анатоль Ярмоленка. У трэцім томе — Уладзімір Гасцюхін, Леанід Шчамялёў, Анатолій Алай, Уладзімір Слабодчыкаў, Леў Гумілеўскі, Аляксандр Яфрэмаў, Валянцін Елізар'еў. Наўрад ці трэба прадстаўляць творчую прафесію кожнага з іх, людзі вядомыя. Пісьменнікі, акцёры, кампазітары, мастакі — усе яны з'яўляюцца яркімі прадстаўнікамі культуры, асветніцтва Беларусі. Дзякуючы зробленаму імі ў мастацтве, культуры, грамадскім жыцці краіны, Беларусь стала больш вядомая свету, зазіхацела новымі дыяментамі. Менавіта без іх цяжка ўявіць беларускую літаратуру, беларускае тэатральнае мастацтва, беларускую музычную культуру, беларускае кіно...



Суразмоўцы Зіновія Прыгодзіча, стваральнікі нашай Айчыны, выказваюцца па самых розных пытаннях. Ох, якое журналісцкае майстэрства патрэбна — прыдумаць пытанні такім асаблівым людзям. Такія пытанні, каб уцягнуць іх у вір шчырай размовы пра сябе і час, каб разварушыць візаві. Так, Зіновій Прыгодзіч гэтымі гутаркамі не проста вымалёўвае партрэты сваіх сучаснікаў, а піша сапраўдную карціну часу. Кнігі пад агульнай назвай «Стваральнікі» адкрываюць мноства цікавых фактаў, дазваляюць зразумець, якія жыццёвыя і творчыя прыярытэты вынеслі гэтыя прыродай пазначаныя таленты на самыя значныя вышыні. Дазваляюць зразумець, якой працай, якімі намаганнямі дасягнута зробленае імі. Мяне як чытача радуе, што ў кнігах няма выпадковых сустрэч, здаецца, што ўсе, з кім гутарыў З. Прыгодзіч, — яго шчырыя сябры.

Раю кнігу і студэнтам факультэта журналістыкі, усім, хто авалодвае прафесіяй журналіста, — ці то з разлікам на работу ў папяровым друку, ці то журналіста тэлебачання. Вы знойдзеце на старонках кніг шмат сакрэтаў творчага майстэрства. І, можа быць, ідучы на гутарку з акцёрам або музыкантам, кампазітарам або пісьменнікам, зразумееце, як важна рыхтавацца да гэтых сустрэч.

Упэўнены, што кнігі цыкла «Стваральнікі» патрэбныя і маладым чытачам, якія авалодваюць творчымі прафесіямі альбо толькі выбіраюць. Ужо дзеля таго, каб яны азнаёміліся з перакананнямі сваіх папярэднікаў. Вопыт асоб, якія ўжо сцвердзіліся ў мастацтве, якіх лічаць тварам нацыянальнай культуры, дарагога варты. І нізкі чытацкі паклон пісьменніку і журналісту Зіновію Прыгодзічу, што ён не шкадуе часу на сустрэчы з яркімі майстрамі, якія робяць наша жыццё нашмат прыгажэйшым, прымушаюць духоўна развівацца і ісці наперад.

Дарэчы, **10 лістапада ў Доме літаратара ў Мінску па адрасе вул. Фрунзэ, 5 а 17-й гадзіне пачнецца вечарына, прысвечаная самому Зіновію Прыгодзічу і героям яго кніг «Стваральнікі».** Да сустрэчы не толькі з пісьменнікам, але і з яго суразмоўцамі! Прыходзьце! Не пашкадуеце!

Сяргей ШЫЧКО.

Суайчыннікі

НЕ НАДЫХАЦЦА, НЕ НАГЛЯДЗЕЦЦА, НЕ НАСПЯВАЦЦА...

З якімі эмоцыямі беларусы замежжа праходзілі творчую стажыроўку

Творчыя стажыроўкі, на якіх кіраўнікі замежных беларускіх калектываў мастацкай творчасці і грамадскіх арганізацый беларусаў замежжа знаёмяцца з гісторыяй, культурай, традыцыямі і сучасным жыццём нашай краіны, ладзяцца з 2016 года.

Дзякуючы Міністэрству культуры і Рэспубліканскаму цэнтру нацыянальных культур падобнымі сустрэчамі мацуюцца сувязі з дыяспарамі і ствараюцца ўмовы для папулярызацыі нашых здабыткаў у краінах пражывання беларусаў замежжа. Колькасць заявак на ўдзел у падобных мерапрыемствах з кожным годам павялічваецца, пашыраецца геаграфія ўдзельнікаў. На гэты раз у праграме ўзялі ўдзел госці з Амерыкі, Італіі, Казахстана, Літвы, Латвіі, Эстоніі, а таксама з розных куткоў Расійскай Федэрацыі. Па веды і па ўражанні прыехалі 39 беларусаў замежжа.

СУСТРЭЧА

— Заўсёды, калі прыязджаю на Радзіму, адчуваю хваляванне незвычайнае. Дыхаю гэтым паветрам, атрымліваю асалоду ад фарбаў, водараў, — дзеліцца ўражаннямі кіраўнік культурнага цэнтра «Беларусь» Паўладарскай вобласці Казахстана Любоў Богнат. — Калі трапляеш сюды, адчуванні сапраўды неперадавальныя, бясконца слёзы радасці і замілавання...

22 гады жанчына ўзначальвае грамадскую арганізацыю, якая аб'ядноўвае беларусаў у Казахстане, захоўвае і прапагандуе культуру, традыцыі, перанятыя ад дзядоў і бацькаў. Тут імкнуцца не забывацца на народны каляндар, адзначаюць Каляды, Масленіцу, Гуканне вясны і іншыя святы. З розных куткоў Казахстана беларусы з'язджаюцца на купальскі фестываль. Моладзі вельмі падабаюцца карагоды. Уражвае сваімі танцамі і калектыў «Крынічка», сабраны пераважна з этнічных беларусаў — некаторым бабулям, якія захоўваюць нацыянальныя песні і танцы, ужо за 80 гадоў.

Падчас сустрэчы з міністрам культуры Анатолем Маркевічам, што прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы, Алена Богнат атрымала сертыфікат на цымбалы. Гэты музычны інструмент яны папрасілі ў міністра летась, калі ён наведваў Дні беларускай культуры, што праходзілі ў Казахстане.

УСІХ ПАЯДНАЛА... «КУПАЛІНКА»

Удзельнікаў стажыроўкі ў Нацыянальнай бібліятэцы чакаў творчы сюрпрыз — выхаванка Мінскага музычнага каледжа пачала іграць для іх «Купалінку». Чатыры дзясяткі людзей, якія прыехалі з розных краін і яшчэ не паспелі перазнаёміцца, адначасова пачалі спяваць. У адзін голас, у адно дыханне. У многіх на вачах былі слёзы.

На сустрэчы ў Нацыянальнай бібліятэцы прадстаўнікі беларускай дыяспары за шматгадовую плённую працу па захаванні і перадачы нацыянальных традыцый атрымалі ўзнагароды ад Міністэрства культуры.

Таксама беларусы замежжа змаглі задаць пытанні міністру культуры. У асноўным пытанні датычыліся далейшага супрацоўніцтва. Так, старшыня Алушцінскай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Сябры» Віталь Бартохаў распавёў, што ў Ялце беларуская дыяспара штогод ускладае кветкі на магіле Максіма Багдановіча, адзначае даты, звязаныя з жыццём і творчасцю пісьменніка. Так, на наступны год запланаваны мерапрыемствы, прымеркаваныя да 110-годдзя выхаду ў свет зборніка Багдановіча «Вянок».

Міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ уручае дыплом старшыні грамадскага аб'яднання «Культурны цэнтр «Беларусь» Паўладарскай вобласці» Любові БОГНАТ.

Фота Лізаветы ГОПАД.

Беларускі цэнтр навучання і развіцця EVA-Studiorum у горадзе Талін шмат увагі аддае рабоце з дзецьмі. Тут створана адзіная ў Эстоніі ліцэнзаваная беларуская нядзельная школа. Дзеці спяваюць і танцуюць, знаёмяцца з творчасцю беларускіх пісьменнікаў, адзначаюць іх юбілеі. Праведзены сустрэчы, прысвечаныя Максіму Багдановічу, Янку Купалу, Паўлюку Пранузе, Еўдакіі Лось. Кіраўнік беларускага цэнтра навучання і развіцця Ніна Пээрна ўзняла пытанне па пашырэнні сувязяў. Важна, каб кожнае мерапрыемства, што праводзіцца ў цэнтры, мела працяг, водгук з Беларусі.

Маладыя людзі з Чэлябінска, дзе ствараецца новая беларуская суполка, з сумам канстатавалі, што ад бацькоў ім ужо не ўдалося пераняць беларускую мову, але ёсць вялікае жаданне яе вывучаць, больш даведвацца пра свае вытокі. Так узнік запыт на распрацоўку дапаможнікаў па вывучэнні беларускай мовы для дарослых.

Таццяна Пумпулева, кіраўнік культурнай асацыяцыі «BELLARUS», якая знаходзіцца ў горадзе Неапаль, звярнула ўвагу, што ў Італіі патрэбныя беларускія сувеніры з надпісамі на лацініцы. З тых жа ручнікоў, з якімі выходзяць прадстаўнікі дыяспары на сцэну, напрыклад, слова «Беларусь», пададзенае на кірыліцы, «не счытваецца».

Міністр культуры заўважыў, што такія сустрэчы ўзбагачаюць абодва бакі. Беларусы замежжа дзеляцца сваімі напрацоўкамі. У сваю чаргу, на стажыроўцы яны атрымліваюць багата інфармацыі пра культуру, традыцыі і работу, якая праводзіцца для захавання самабытнай спадчыны. Дадому госці едуць з ідэямі, якія могуць рэалізоўваць у сябе. Такія сустрэчы садзейнічаюць развіццю культурнай дыпламатыі. «Чым больш нашы землякі распавядуць добрых праўдзівых слоў у сябе на месцах, тым больш зразумелая, справядлівая і аб'ектыўная карціна будзе прадстаўлена пра нашу краіну. Яны могуць сваімі вачыма ўбачыць, адчуць і перанесці ўсе эмоцыі, распавесці пра прыгажосць нашай краіны тым людзям, якія за мяжой чакаюць добрых навін і пасылаў ад нашых землякоў», — упэўнены Анатоль Маркевіч.

НОВЫЯ ВЕДЫ

Праграма творчай стажыроўкі была вельмі насычанай. Госці наведалі мемарыяльны комплекс «Трасцянец», Храм-Помнік у гонар Усіх Святых у Мінску, Мірскі і Нясвіжскі замкі. У Лагойску яны пабывалі ў раённым цэнтры культуры, пазнаёміліся з мастацкай галерэяй Сяргея Давідовіча. На майстар-класах вучыліся вакалу, танцам, рамёствам, знаёміліся з нацыянальнай кухняй. На цэлы дзень беларусы замежжа ператварыліся ў навучэнцаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, дзе не проста даведаліся, якая сімволіка схавана ў танцах і якая спецыфіка ў розных рэгіёнаў Беларусі, але і засвойвалі тэхніку выканання асобных элементаў «Крыжачка», «Мікіты», «Зязюлі», «Лявоніхі», запісвалі словы песні, пад якую можна пагуляць у «Падушачку», слухалі аўтэнтычныя спевы ў выкананні студэнцкіх калектываў.

Госці ўпэўненыя, што новыя веды будуць запатрабаваныя ў краінах іх пражывання. Так Віктар і Наталля Сінкевічы з вёскі Тургенеўка Іркуцкай вобласці захапіліся беларускімі танцамі і спевамі, якія плануюць выкарыстоўваць у тым ліку і ў рабоце з турыстамі. У іх вёсцы, якая стваралася ў часы Сталыпінскай рэформы, ужо больш за стагоддзе жывуць беларусы. Захоўваюцца культура, нацыянальная кухня, працуе этнаграфічны музей. І, як аказалася, гэты захаваны з часоў дзядоў уклад беларускай вёскі цікавы гасцям, якія прыязджаюць у Сібір. І вандроўкі ў беларускую вёску — адзін з найпапулярнейшых сельскіх маршрутаў у Іркуцкай вобласці.

Традыцыйна ў межах творчай стажыроўкі госці сустракаюцца ў апараце Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Аляксандр Румак распавёў суайчыннікам пра работу, якая праводзіцца ў краіне для падтрымкі беларусаў замежжа і перспектывы супрацоўніцтва: «Кожная такая сустрэча — для нас свята. Мы заўсёды стараемся падабраць літаратуру, якую вы зможаце выкарыстоўваць у сваёй рабоце. Вельмі кранае, калі за тысячы кіламетраў адсюль малыя пішуць вершы, малююць карціны па сюжэтах беларускіх казак. Гэта прыклад і для дзяцей у нашай краіне, як можна любіць і цаніць тое, што маеш».

Пра традыцыі, якія захоўваюцца і перадаюцца на беларускіх землях, удзельнікам творчай стажыроўкі расказалі кандыдат культуралогіі Янка Крук і дацэнт кафедры рэжысуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аксана Катовіч. З мэтай захавання і папулярызацыі беларускай культуры і гісторыі суайчыннікам былі перададзены кнігі пра памятныя мясціны Беларусі, а таксама пра беларускія нацыянальныя традыцыі і правілы народнай культуры. Кіраўнікам грамадскіх аб'яднанняў беларусаў замежжа былі ўручаны ўзнагароды і перададзены нацыянальныя касцюмы.

Алена ВАЙЦЯХОВІЧ.

Да ведама

У Беларусі шмат робіцца для таго, каб суайчыннікі за мяжой маглі захаваць культуру сваёй нацыі, этнічную самабытнасць, адстойваць і прасоўваць інтарэсы гістарычнай радзімы ў краінах пражывання. За апошнія пяць гадоў беларускім творчым калектывам з дваццаці краін свету бязвыплатна перададзена больш за 700 камплектаў беларускіх касцюмаў, дзве тысячы выданняў, 850 вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, 50 народных музычных інструментаў. За гэты час 70 беларускіх самадзейных і прафесійных калектываў бралі ўдзел у 14 фестывалях. 46 творчых дэлегацый беларусаў замежжа ўдзельнічалі ў розных мерапрыемствах у нашай краіне. Упершыню ў 2022 годзе ў Фестывалі нацыянальных культур у Гродне ўзялі ўдзел беларусы з Расіі і Латвіі. А ўжо налета ў нашай краіне пройдзе фестываль мастацтваў беларусаў свету.

Нельга забыць

СТРАШНАЯ ТАЙНА ЧОНКАЎСКАГА ЛЕСУ

Тут фашысты расстралялі мірных жыхароў Гомельшчыны і Чарнігаўшчыны

У 2021 годзе пачалося расследаванне крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У Чонкаўскім лесе, дзе фашысты стварылі сапраўдную фабрыку смерці, былі знойдзены астанкі амаль паўтысячы чалавек, якія перапахаваны з захаваннем усіх рэлігійных традыцый. Ад пачатку аднаўлення раскопак у красавіку 2022 года з'явіліся новыя бясспрэчныя факты аб генацыдзе мірнага насельніцтва на тэрыторыі БССР. Высветлілася, што тут дзейнічаў сапраўдны лагер смерці пад адкрытым небам — як у Азарычах.

Крывавая старонка гісторыі

На пошукі дакладнага месца пахавання было патрачана нямала часу, бо пра яго быў усяго толькі кароткі запіс у архіўных дакументах: на 9-м кіламетры шашы Гомель—Чарнігаў знішчаны вязні чатырох яўрэйскіх гета і мірныя жыхары. Пракуратура Гомельскай вобласці да гэтага часу праводзіць карпатлівую работу па пошуку доказаў у архівах Камітэта дзяржаўнай бяспекі. У пратаколах допытаў паліцаяў часта знаходзяць звесткі, якія становяцца асновай для далейшых пошукаў.

— Палявыя работы праводзяць байцы 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, якім дапамагаюць кадэты, што знаходзяцца ў пошукавым клубе «Пунсовыя пагоны», — расказаў **намеснік пракурора Гомельскага раёна Аляксандр ШЫНКАРОЎ.** — На дадзены момант выяўлена 29 расстрэльных ям. Летась з іх было паднята амаль 500 касцяных астанкаў мірных жыхароў, якія пасля перапахавалі.

Аднак, нягледзячы на гэта, нават прыблізна акрэсліць межы тэрыторыі, дзе праводзіліся масавыя расстрэлы, немагчыма. Як і меркаваць, колькі людзей тут загінула. Справа ў тым, што брацкія магілы, глыбіня якіх ад 2,5 да 5 метраў, маюць некалькі «ярусаў». У адным такім пахаванні знаходзяць астанкі 60—70 мірных жыхароў.

— Мяркуючы па характары іх залягання, можна зрабіць выснову, што ў некаторых брацкіх магілах у ахвяр рукі былі звязаныя за спінай, — адзначыў Аляксандр Шынкароў. — Прычынай смерці былі два выстралы: асноўны і кантрольны. Аднак у некаторых расстрэльных ямах астанкі размешчаны хаатычна, тут знойдзены і асколкі гранат. Гэта сведчыць аб тым, што замест выстралаў нацысты закідвалі ў яму гранаты...

Не ведалі, што ідуць на смерць

Паводле слоў намесніка пракурора Гомельскага раёна Аляксандра Шынкарова, пасля дэталёвага вывучэння месца размяшчэння і колькасці выяўленых астаткаў нямецкіх палатак і стацыянарных бліндажоў можна ўстанавіць, што тут пастаянна знаходзілася расстрэльная каманда колькасцю да 500 чалавек.

Ваеннаслужачыя пошукавага батальёна ўсё часцей знаходзяць рэчы, якія належалі немцам. Сярод іх — сапёрная складаная рыдлёўка, гільзы і кулі, ножны ад нямецкага кінжала, так званая лазанцінніца на выпадак хімічнай атакі, банкі з-пад кансерваў і спіртнога з маркіроўкамі розных еўрапейскіх краін, пфеніг 1940 года і іншыя прадметы з нямецкімі надпісамі і гравіроўкамі.

Усё гэта неабвержна даказвае, што ў ваколіцах Гомеля дзейнічала сапраўдная фабрыка смерці. Аднак сярод мірных ахвяр нацыстаў былі не толькі жыхары Гомельшчыны, але і суседняй Чарнігаўшчыны: некаторыя рэчавыя доказы проста на тое ўказваюць. У адной з расстрэльных ям знойдзены асколак талеркі і кубак, на якіх захаваліся надпісы «Укртрэст» і «Луганск» адпаведна.

— Пацвярджэнне дадзенаму факту ўдалося знайсці і ў архівах, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Шынкароў. — У 1942 годзе з горада Шчорса і навакольных вёсак нямецкія акупанты пагналі жыхароў у бок Гомеля. Далейшы іх лёс быў невядомы ажно да моманту, калі вайскоўцы 52-га асобнага пошукавага батальёна не паднялі іх астанкі з расстрэльных ям. Прычым людзі не ведалі, што ідуць на смерць: прычынамі для збору і перамяшчэння аб'яўлялі то перасяленне, то выдачу дакументаў, то нейкія работы...

Новыя рэчавыя доказы (а з расстрэльных ям паднята больш за тысячу спадарожных знаходак, якія праходзяць балістычную і іншыя экспертызы) пацвярджаюць яшчэ больш страшную здагадку: для правядзення масавых пакаранняў смерцю фашысты часта выкарыстоўвалі трафейную савецкую зброю. А вось патроны для яе выраблялі на еўрапейскіх заводах зброі. У прыватнасці, нямецкія гільзы калібру 7,63 мм, якія выпускаў нямецкі завод Geco, ідэальна падыходзілі да пісталета ТТ, пісталета-кулямёта сістэмы Шпагіна. Дарэчы, завод да гэтага часу існуе і па-ранейшаму выпускае боепрыпасы.

Месца жывой памяці

Жыхары краіны, у тым ліку школьнікі, павінны ведаць, чым для нашых народаў стала нямецкая акупацыя і як планамерна фашысты знішчалі мірных жыхароў. Таму органы пракуратуры Гомельскай вобласці арганізавалі падрыхтавалі нямецкія карнікі нашаму народу. Малады чалавек і раней ведаў, што ў Чонкаўскім лесе праводзяцца раскопкі, але незабыўнае ўражанне засталося толькі пасля таго, як удалося дакрануцца да знойдзеных рэчаў, паназіраць за работай ваенных пошукавікаў і пачуць пра ўстаноўленыя ваенныя злачынствы нацыстаў на нашай зямлі.

Тым жа, хто кажа, маўляў, навошта падымаць касцявыя астанкі з зямлі, трэба нагадаць адну страшную сустрэчу, зафіксаваную ў дакументах. Гэта здарылася ў

наведванне пахаванняў для прадстаўнікоў працоўных калектываў некалькіх прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў адукацыі Гомеля і Гомельскага раёна, а таксама ўдзельнікаў патрыятычнага аўтапрабегу. Сёлета месца жывой памяці наведала ўжо больш за паўтары тысячы чалавек.

Пракуратура Гомельскага раёна прадэманстравала рэчавыя доказы знішчэння мірных грамадзян акупантамі і іх памагатымі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мерапрыемствы праходзілі з усладаннем кветак да памятнага знака, узведзенага ахвярам генацыду беларускага народа. Паводле слоў курсанта ваенна-транспартнага факультэта БелДУТ Максіма Кісялёва, ён змог дакрануцца да гісторыі і ўсвядоміў, якую будучыню жніўні 1941-га ў навакольлях вёскі Краснае (цяпер аграгарадок) і пасёлка Чырвоны Багатыр. Процітанкавы роў, які выкапалі гараджане, спадзеючыся затрымаць наступленне ворага, пасля акупацыі Гомеля нямецка-фашысцкімі захопнікамі стаў вялізнай брацкай магілай для ваеннапалонных лагера Дулаг-121 і яўрэяў, жыхароў Гомеля. Пасля чарговай расправы адзін хлопец падышоў да рова і ўбачыў, як памірае чырвонаармеец, які з апошніх сіл прамовіў: «Запомні гэтае месца, сынок, каб потым пахаваць нас па-чалавечы!»

— Менавіта таму аднавіць гістарычную справядлівасць — наша агульная і важная задача, — рэзюмаваў Аляксандр Шынкароў.

Ірына ГРАМЫКА.
Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

У брэсцкім парку Воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Парадак на зямлі

ПАСАДЗІ СВАЁ ДРЭВА

Асеннія экалагічныя акцыі праходзяць па ўсёй Брэстчыне

Традыцыйна ўвосень у гарадах і сельскіх населеных пунктах праводзяцца прыборка тэрыторый, маштабнае навядзенне парадку. Нездарма шматлікія госці нашай краіны адзначаюць чысціню і парадак амаль як брэнд. Парадак жа бывае там, дзе яго падтрымліваюць. Прыклад у дадзенай справе падаюць вертыкаль улады, дэпутаты, грамадскія арганізацыі.

Вось і ў Брэсце прайшла вялікая акцыя па навядзенні парадку ў парку Воінаў-інтэрнацыяналістаў, які знаходзіцца ва ўсходнім раёне горада. Сёлета парк перажыў значнае абнаўленне і рэканструкцыю. За паўгода было адрамантавана больш за пяць тысяч квадратных метраў тратуараў, на сарака гектарах выдалілі больш за тысячу аварыйных і сухіх дрэў. Устаноўлены новыя ліхтары, абсталяваны чатыры спартыўныя пляцоўкі, адрамантавана эстрада, мадэрнізавана сістэма відэаназірання. Усё гэта дазваляе казаць, што парк атрымаў новае жыццё.

Але ж работа па паляпшэнні парку працягваецца. І ў адзін з выхадных дзён тут паявіўся вялікі працоўны дэсант на чале са **старшынёй аблвыканкама Юрыем ШУЛЕЙКАМ.** У акцыі ўзяло ўдзел больш за 260 чалавек, большую частку з іх склалі супрацоўнікі аблвыканкама і гарвыканкама. Абласную і гарадскую вертыкаль падтрымалі прадстаўнікі дэпутацкага корпуса, грамадскіх арганізацый, а таксама ўстаноў і прадпрыемстваў горада.

Удзельнікі акцыі праводзілі санітарную абрэзку і ачыстку маладога ляснога масіву. Работы хапіла ўсім, а праз некалькі гадзін тэрыторыя, дзе працавалі валанцёры, ужо выглядала па-іншаму, радуючы чысцінёй і парадкам.

Юрый Шулейка ў размове з журналістамі адзначыў, што любы абласны горад з'яўляецца прыкладам для рэгіёна ў цэлым:

—...І павінен задаваць тон у галіне культуры сацыяльнай сферы, навядзення парадку і стварэння камфорту. Як вядома, у абласныя цэнтры ўкладваюцца большыя сродкі, чым у іншыя населеныя пункты. Ну і аддача ад нас, жыхароў абласных цэнтраў, павінна быць адпаведная. Усе мы можам зрабіць унёсак у чысціню, парадак, утульнасць роднага горада.

Варта сказаць, што добрую справу падтрымліваюць ва ўсіх райцэнтрах і іншых населеных пунктах. Актыўна вядуцца работы па добраўпарадкаванні, навядзенні чысціні, садзяцца дрэвы. У Пінску за апошнія тыдзень-два праведзена некалькі працоўных акцый. Напрыклад, у вуліцу Мінеева нядаўна ўпрыгожылі маладыя туі. У раёне сярэдняй школы № 10 пасадзілі 350 маленькіх прыгожых дрэў. У іх пасадцы ўдзельнічалі работнікі камунальнай гаспадаркі, гаррайінспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, гарадскога архіва, навучэнцы і выкладчыкі аграрнага тэхналагічнага каледжа і прадстаўнікі іншых арганізацый.

Тым часам актывісты гарадской арганізацыі «Белая Русь» вывелі сваіх прыхільнікаў у сквер, названы ў гонар 900-годдзя Пінска. Сябры грамадскай арганізацыі прыбіралі сквер, расчышчалі дарожкі ад апалай лістоты і галінак. Хутка сквер набыў дагледжаны выгляд.

У Каменцы напярэдадні кастрычніцкіх свят прайшла маштабная акцыя «Пасадзі сваё дрэва». На вуліцы Рабінавай у гэты дзень зашумелі 20 новых рабінак. Іх пасадзілі актывісты раённай арганізацыі «Белая Русь» і супрацоўнікі ЖКГ на чале з яе дырэктарам Паўлам Заграем. На вуліцы 70 год Кастрычніка прадстаўнікі грамадскіх арганізацый пасадзілі клёны. На вуліцы Леваноўскага таксама будуць расці маладыя дрэвы, тут працавала каманда спартыўнай супольнасці. А на вуліцы Пагранічнай каля ракі Лясная з'явілася 17 бярозак. На гэтай жа вуліцы каманда райвыканкама высадзіла алею з 26 клёнаў. Такім чынам за дзень горад стаў прыгажэйшым.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з адкрытых крыніц.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
9 лістапада 2022 г. № 43 (679)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў ЖЫЦЦЁ

Органы ўлады, мясцовага кіравання і самакіравання лепш бачаць, чым жыве раён, якія ёсць рэсурсы

Фота БелТА.

На Гомельшчыне сёння распрацаваныя 134 інвестыцыйныя праекты. Іх рэалізацыя дапаможа значна ўзмацніць раёны рэгіёна эканамічна. Як эканамічнае развіццё дапамагае стаць сацыяльна моцнымі? Актуальнае пытанне на прыкладзе Петрыкаўскага раёна было разгледжана падчас выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. Удзельнікамі сустрэчы ў рэгіёне сталі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, а таксама кіраўнікі рэспубліканскіх органаў улады, прадстаўнікі выканаўчай вертыкалі, мясцовых органаў улады і дэпутаты ўсіх узроўняў.

Растуць дамы, а ў іх — новыя сем'і

Вядома, што Петрыкаўскі раён Гомельшчыны моцны імпульс развіцця атрымаў пасля таго, як у гэтым палескім рэгіёне пачалася рэалізацыя інвестпраекта ААТ «Беларуськалій» па будаўніцтве горна-абагачальнага камбіната. Урачысты запуск Петрыкаўскага горна-абагачальнага комплексу адбыўся ў жніўні мінулага года.

— Прэзідэнт паставіў задачу распрацаваць радовішча і пабудаваць завод. За 6 гадоў задача была рэалізавана, і гэта стала імпульсам для імклівага развіцця раёна, — нагадала Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава ў пачатку работы выязнога пасяджэння на базе Петрыкаўскага рудаўпраўлення ААТ «Беларуськалій».

Новае жыллё, установы адукацыі і спорту... Аб тым, як развіццё сацыяльнай сферы садзейнічае замацаванню кадраў на прадпрыемстве, расказаў генеральны дырэктар ААТ «Беларуськалій» Іван Галаваты. Па яго словах, яшчэ 10-15 гадоў таму на прадпрыемствах пачала набіраць абароты тэндэнцыя раздзялення «на актывы». Многія няпрофільныя ўстановы адукацыі, дзіцячыя садкі, жыллё — з балансаў прадпрыемстваў перадавалі гораду, раёну. «Беларуськалію» ўдалося тады абараніць падобныя актывы, што і дало свой вынік.

— Беларусь — сацыяльна арыентаваная краіна, і на прадпрыемстве важна таксама падтрымліваць сацыяльную праграму. Мы працягваем прытрымлівацца сацыяльнай накіраванасці прадпрыемства — і ў Салігорску, і ў Петрыкаўскім раёне, — акцэнтаваў увагу Іван Галаваты.

Падчас азнаямленчай экскурсіі па мікрараёне «Паўночны» Петрыкава члены Прэзідыума Савета Рэспублікі змаглі ацаніць тэмпы развіцця сацыяльна значнай інфраструктуры горада. Новы «мікрараён калійшчыкаў» актыўна забудоўваецца ўжо некалькі гадоў. Летась тут было ўзведзена дзесяць шматкватэрных дамоў, сем — ужо з пачатку бягучага года.

Удзельнікі выязнога пасяджэння азнаёміліся з работай Петрыкаўскага дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці і ацанілі вынікі праведзенай рэканструкцыі акушэрска-гінекалагічнага корпуса цэнтральнай раённай бальніцы. Сёлета па размеркаванні для работы ў сферы аховы здароўя ў Петрыкаў прыехала ўтрая больш выпускнікоў-медыкаў, чым чакалася, звярнула ўвагу падчас аглядной экскурсіі па мікрараёне Наталля Качанава.

— Моладзь не будзе так актыўна імкнуцца ў вялікія гарады, калі іх родныя населеныя пункты будуць сучаснымі, добраўпарадкаванымі, будзе дзе працаваць і жыць, — адзначыла спікер верхняй палаты парламента. — У Петрыкаве менавіта так і адбываецца. А чаму? Тут прыгажосць, парадак, жыллё даецца, зарплата расце. У такіх умовах можна спакойна ствараць сем'і, нараджаць дзяцей — ёсць перспектывы. Па такім жа прынцыпе павінны развівацца і іншыя рэгіёны нашай краіны, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Падарункі і запрашэнне ў госці

У петрыкаўскі фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Прыпяць» Наталля Качанава завітала з падарункамі ад Савета Рэспублікі — прафесійнымі валейбольнымі мячамі.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

Міжнароднае ўзаемадзеянне, абмеркаванне УНС і адкрыццё новых вытворчасцяў

У традыцыйным аглядзе — важныя навіны Савета Рэспублікі

● Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава накіравала віншаванне Віцэ-прэзідэнту, Старшыні Сената Нацыянальнага кангрэса Аргенцінскай Рэспублікі Крысціне Фернандэс дэ Кіршнер з 30-годдзем устанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Аргенцінай. Спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што за мінулы час удалося выбудаваць канструктыўны палітычны дыялог, пашырыць двухбаковыя гандлёва-эканамічныя, навукова-тэхнічныя і гуманітарныя сувязі. Наталля Качанава выказала ўпэўненасць у тым, што заканадаўчыя органы дзвюх краін у межах парламенцкай дыпламатыі адкрыюць новыя перспектывы і будуць садзейнічаць нарошчванню плённага ўзаемадзеяння ў сферах, якія складаюць узаемны інтарэс.

● У Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах абмеркавалі змяненні ў Закон «Аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг)». Парламентарыі і эксперты, якія маюць непасрэднае дачыненне да закупак за кошт бюджэтных сродкаў, на чале са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццянай Рунец закранулі два блокі пытанняў: мінімізацыю злоўжыванняў у сферы дзяржаўных закупак і аптымізацыю іх працэдур. Прадугледжана, што навацыі ў дзеючае заканадаўства дазволяць удасканаліць сістэму дзяржзакупак. Гэта, з аднаго боку, дазволіць своечасова задаволіць патрэбы заказчыкаў у таварах (работах, паслугах), з другога, забяспечыць эфектыўнае расходаванне бюджэтных сродкаў і будзе садзейнічаць развіццю канкурэнцыі. Выпрацаваныя прапановы і заўвагі па законапраекце будуць унесены на разгляд экспертнага савета.

● Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец і сенатар, старшыня Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Аляксей Няверaў узялі ўдзел у дыялогавай пляцоўцы для прадстаўнікоў працоўных калектываў, прафсаюзнага актыву Гомельшчыны. Падчас сустрэчы абмяркоўваліся законапраекты «Аб Усебеларускім народным сходзе» і «Аб змяненні Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь». Грамадзян хвалявала, якой будзе роля Усебеларускага народнага сходу ў палітычным жыцці грамадства, хто атрымае права быць выбраным дэлегатам, якім будзе прававы статус дэлегата і як ён будзе рэалізоўваць свае паўнамоцтвы. Сяргей Сівец падкрэсліў, што заканатворчы працэс — гэта не аднамомантная з'ява. «Нават пасля грамадскага абмеркавання тэкст законапраекта будзе карэкціравацца з улікам прапаноў і ініцыятыў, якія паступілі, калі яны рацыянальныя і пойдуць на карысць новаму грамадскаму ладу», — адзначыў сенатар.

● Падчас рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы ўзяў удзел у адкрыцці малочна-таварнай фермы ў Ляхавіцкім раёне. Таксама сенатар сустрэўся з працоўным калектывам Ляхавіцкага малочнага завода. Людзей хвалявалі розныя пытанні: ад цанавой палітыкі дзяржавы да няпростай знешнепалітычнай сітуацыі. Міхаіл Русы расказаў аб перспектывах сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны, аб удзеле кожнага грамадзяніна ва ўмацаванні эканомікі Беларусі. Працоўных цікавілі і прававы статус Усебеларускага народнага сходу, парадак фарміравання і рэалізацыі паўнамоцтваў УНС, прынцыпы і арганізацыйныя асновы яго дзейнасці, правы і абавязкі дэлегатаў УНС. Парламентарый азнаёміўся з работай прадпрыемства, адзначыўшы пры гэтым высокую эфектыўнасць вытворчасці.

Вераніка КАНЮТА.

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў ЖЫЦЦЁ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

— Новы спартыўны інвентар зробіць трэніроўкі яшчэ больш прадукцыйнымі, а спартсмены абавязкова зоймуць прызавыя месцы на спаборніцтвах розных узроўняў, — падзякавала Наталлі Качанавай трэнер петрыкаўскай валейбольнай каманды Вікторыя Парэцкая. Дзяўчына падзялілася, што чатыры гады таму маладым спецыялістам вярнулася працаваць у ДЮСШ у родным Петрыкаве. Мясцовая моладзь, якая з'язджае вучыцца, сёння вельмі ахвотна вяртаецца назад у раён, адзначалі таксама і ўдзельнікі каманды.

Наталля Качанава запрасіла выхаванцаў петрыкаўскай спартыўнай школы прыехаць у Савет Рэспублікі: каб на свае вочы ўбачыць, як дзейнічае найвышэйшы дзяржаўны заканадаўчы орган улады.

Бачыць, чым жывуць людзі

Падчас пленарнага пасяджэння Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на важнасць правядзення такіх выязных мерапрыемстваў.

— Гэтыя сустрэчы вельмі эфектыўныя — ёсць чаму павучыцца адзін у аднаго. Калі выязджаем у раёны, мы бачым, як моцна людзі адданыя сваёй краіне і малой радзіме. Я знаходжуся пад вялікім уражаннем ад таго, як моладзь, з якой мы паспелі пагутарыць, гаварыла аб сваім Петрыкаве. І гэты цудоўны горад таго заслугоўвае!

Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што ў краіне працягваецца работа над праектам закона аб мясцовым кіраванні

Фота БелТА.

і самакіраванні. Парламентарыям вельмі важна пачуць заўвагі і прапановы ад жыхароў раёнаў.

— Кожны рэгіён павінен развівацца — гэта трэба зрабіць для нашых людзей. Органы ўлады, мясцовага кіравання і самакіравання лепш бачаць, чым жыве раён, якія ёсць рэсурсы, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Больш эфектыўна задзейнічаць мясцовыя органы кіравання і самакіравання ў развіцці рэгіёнаў — даручэнне кіраўніка дзяржавы. Моцныя рэгіёны — гэта і задача, якая вызначана VI Усебеларускім народным сходам. Таму ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў выязнога пасяджэння — і работа прадпрыемстваў, і функцыянаванне сацыяльнай сферы, і ЖКГ. Важна вызначыць, што яшчэ сёння трэба зрабіць для таго, каб людзі жылі камфортна, каб моладзь, атрымаўшы адукацыю, вярталася на сваю малую радзіму — жыць, працаваць і развіваць свой горад, свой раён, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі высока ацаніла работу мясцовых органаў улады і дэпутацкага корпуса на Гомельшчыне:

— Мы не першы раз наведваем Гомельскую вобласць. Тут работа пабудавана належным чынам і ў плане навядзення парадку, добраўпарадкавання, развіцця інфраструктуры. Гэта сведчыць аб тым, што людзі і самі клапоцяцца аб тым, што ўжо зроблена. Так, пэўныя сродкі на тое затрачваюць дзяржава, мясцовыя органы кіравання, але вырашэнне такой задачы было б немагчымае без удзелу саміх грамадзян, якія жывуць тут, — падкрэсліла спікер. — Я бачу, як працуюць члены Савета Рэспублікі, якія прадстаўляюць Гомельскую вобласць, узаемадзейнічаючы з людзьмі і вызначаючы задачы, што неабходна вырашаць на мясцовым узроўні, дапамагаючы людзям у пытаннях, якія іх хвалююць.

Палешукі-ўмельцы

Пасля пленарнага пасяджэння ўдзельнікі яго азнаёміліся з перспектывамі развіцця дзяржаўнай прыродаахоўнай установы на прыкладзе Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» ў Петрыкаўскім раёне.

Як расказаў **генеральны дырэктар нацпарка Юрый АПАНОВІЧ**, асноўная дзейнасць «Прыпяцкага» сёння — дрэваапрацоўка, турызм і лясная гаспадарка.

— Па турыстычнай дзейнасці колькасць турыстаў сёлета ў параўнанні з апошнімі гадамі значна выраслa. Заяўляе аб сабе ўнутраны турызм. У цэлым у студзені — жніўні гэтага года нацпарк наведала на 70 % больш турыстаў, чым за 9 месяцаў мінулага года. Павялічваецца і сярэдні чэк. Людзі атрымліваюць больш паслуг, — удакладніў Юрый Апановіч.

Сёння ў нацпарку таксама распачалі рэалізацыю перспектыўнага інвестпраекта — увод цэха пелетнай вытворчасці. Яна дасць магчымасць дадаткова стварыць 20 рабочых месцаў. Магутнасць вытворчасці складзе каля 20 тысяч тон пелет у год.

— Яшчэ на стадыі будаўніцтва на нас ужо выходзяць партнёры. Мы будзем выпускаць і прэміяльныя, і індустрыяльныя пелеты, — удакладніў генеральны дырэктар.

Наталля Качанава адзначыла добрую якасць прадукцыі нацпарка. Члены Прэзідыума Савета Рэспублікі наведалі гісторыка-этнаграфічны комплекс — музей пад адкрытым небам. У рамеснай слабадзе майстры прадставілі ўдзельнікам выязнога пасяджэння рамёствы, традыцыйныя для палескай зямлі: разьбу па дрэве, ганчарства, ткацтва, кавальскую справу, бондарства і саломапляценне, нацыянальную кухню і многае іншае.

Наталля Качанава падзякавала майстрам за захаванне беларускіх традыцый і падкрэсліла: на Палессі жывуць сапраўдныя ўмельцы, творчыя, добрыя, адкрытыя людзі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

СТАРАСТА ПРЫЙШОЎ ДА ДЭПУТАТА...

Актыўныя людзі на месцах — памочнікі ў вырашэнні лакальных праблем

Сустрэчы дэпутатаў розных узроўняў з жыхарамі рэгіёнаў даюць магчымасць людзям расказаць пра набалелыя пытанні, а парламентарыям — пачуць кожнага чалавека асабіста і прыняць правільнае рашэнне, пастарацца дапамагчы.

Жыхары аграгарадка Дзешчанка Уздзенскага раёна мелі магчымасць выказацца па актуальных пытаннях свайго рэгіёна падчас прыёму грамадзян **дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Людмілай НІЖЭВІЧ**, які яна правяла ў мясцовым сельвыканкаме. Заяўнікі прыходзілі ў сельсавет з самымі рознымі пытаннямі.

Алена Паўлаўна пражывае ў Дзешчанцы ў 16-кватэрным доме на першым паверсе. Да нядаўняга часу ў жыллі было ўсяго 11 градусаў цяпла. Праўда, яе просьбу чыноўнікі пачулі і на днях наладзілі ацяпленне. Але з'явілася новая праблема. У памяшканні мокрая сцяна, адвальваюцца шпалеры, у падвале па калена вады.

Старшыня сельвыканкама Уладзімір Балцянкоў растлумачыў, што ў доме ідзе капітальны рамонт. А вільгаць трапляе ў жылое памяшканне па ліўневай трубе, якая прагніла і патрабуе замены.

— Не хвалюйцеся. Мы запросім людзей, якія адказваюць за рамонт, каб яны выехалі да вас і яшчэ раз прааналізавалі сітуацыю, — супакоіла жанчыну Людміла Ніжэвіч.

І тут жа па яе просьбе старшыня Уздзенскага раённага Савета дэпутатаў Ігар Пятровіч патэлефанаваў намесніку старшыні райвыканкама Мікалаю Рацкевічу, які выедзе на месца і дасць ацэнку рабоце падрадчыкаў. Хібы будуць выпраўлены згодна з праектам і будаўнічымі нормамі.

Іна Аляксандраўна з мужам хочуць адкрыць у населеным пункце бар. І такое памяшканне ў Дзешчанцы ёсць — з падведзенай вадой, усімі неабходнымі камунікацыямі. Але яно знаходзіцца ў арэндзе, выкарыстоўваецца пад склад ветпрэпаратаў.

— Проста так, беспадстаўна выкінуць з памяшкання арандатара ніхто не можа. Трэба паглядзець дагавор, тэрмін яго дзеяння, ці выконваюцца яго ўмовы, ці аплачваюцца камунальныя паслугі. І толькі ў выпадку парушэнняў прапісаных тут пунктаў можна разарваць дагавор, — рэзюмавала Людміла Ніжэвіч.

Дадам, што будынак знаходзіцца ва ўласнасці Уздзенскага раённага спажывецкага таварыства. Як адзначыў антыкрызісны кіраўнік райспажыўсаюза Аляксандр Яноўскі, які прыехаў на сустрэчу з дэпутатам, грамадзянка па дадзеным пытанні да яго не звярталася, але яно цалкам вырашальнае.

Найбольшую колькасць актуальных для аграгарадка тэм агучыў старасta Дзешчанкі Генадзь Быцай.

На аўтобусным прыпынку, што знаходзіцца на ажыўленай Слуцкай аўтатрасе, доўгі час не гарыць вулічнае асвятленне. Гэта стварае небяспеку для людзей, якія пераходзяць дарогу ў цемры.

Старшыня сельвыканкама растлумачыў, што неаднаразова звяртаўся ў «Белаўтадар», у адказ — толькі абяцанкі. Ігар Пятровіч параіў вырашыць пытанне праз Дзяржаўную аўтаінспекцыю.

Звярнуў увагу прысутных Генадзь Быцай і яшчэ на адну праблему — дзіцячы садок перапоўнены, малых сюды не прымаюць. Будынак, дзе раней месцілася дашкольная ўстанова, прыйшоў у непрыдатнасць. Яго прадалі камерсантам, яны перакрылі дах, умацавалі фасад і закансервавалі.

Спыніўся заяўнік і на дарожных праблемах. У прыватнасці, прасіў заасфальтаваць вуліцу Цэнтральную — самую старую ў Дзешчанцы.

— З такой просьбай да нас звярталіся жыхары населенага пункта. Мы сапраўды планавалі пакласці тут цвёрдае пакрыццё за кошт сродкаў ад рэалізацыі на аўкцыёнах зямельных участкаў. Але памянялі рашэнне на карысць раёна індывідуальнай забудовы ў вёсцы Валодзькі, дзе выдзелена для ўзвядзення дамоў 160 участкаў. Дарога тут вузкая, інтэнсіўны рух аўтатранспарту. А на вуліцы Цэнтральнай дарожнікі зрабілі падсыпку, утрамбавалі. Пры наяўнасці сродкаў абавязкова яе асфальтуем, — запэўніў Уладзімір Балцянкоў.

Генадзь Быцай выказаў таксама меркаванне, што ў вёсцы Целякова неабходна ўладкаваць дзіцячую пляцоўку. Людміла Ніжэвіч падтрымала заяўніка і паабяцала пасадзейнічаць з яе абсталяваннем.

— Нядрэнна таксама правесці там свята вёскі, усёй талакой добраўпарадкаваць населены пункт, — прапанаваў мужчына. З ім пагадзіліся ўсе прысутныя.

Хвалюе старасту і тое, што ў населеным пункце выстаўлены на продаж гандлёвы цэнтр, які належыць райспажыўсаюзу. А сюды ходзяць па пакупкі пенсіянеры, таму што тут ім даецца скідка ў 10 працэнтаў на сацыяльна значныя тавары. Наведваюцца сюды і пажылыя людзі з суседніх вёсак. Па словах Генадзя Іванавіча, у гэтым гандлёвым аб'екце ў параўнанні з прыватнымі крамамі больш шырокі асартымент, прымальныя цэны.

— Пытанне возьмем на заметку, будзем разбірацца, з якой прычыны хочуць закрыць краму, — сказала Людміла Ніжэвіч.

Уздзенскае спажывецкае таварыства знаходзіцца ў стадыі санацыі, прызначаны антыкрызісны кіраўнік. Толькі ў адной Дзешчанцы пражывае каля 900 чалавек. Таму пытанні, як у населеным пункце арганізаваць гандаль, вельмі актуальныя, бо не кожны чалавек мае магчымасць і час ехаць у райцэнтр па неабходныя пакупкі. Трэба развіваць сетку магазінаў крокавай даступнасці, лічыць дэпутат.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ПРЫКЛАД ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ

НЕ ТОЛЬКІ СКАРДЗІЦЦА, АЛЕ І ДЗЯКАВАЦЬ

Гэтым прынцыпам кіруецца ў рабоце адзін з самых вядомых у Магілёве прадстаўнікоў мясцовага самакіравання Аляксандр ПІКУЛЯ

Яго добра ведаюць у, як той казаў, калідорах улады, структуры ЖКГ і іншых службаў. Бо жыхары могуць паскардзіцца на што заўгодна. Аляксандр Пікуля на правах старасты акумулюе гэтыя скаргі на тэрыторыі дзвюх мікразон — Падгорная і Падміколле — і не шкадуе асабістага часу, каб іх вырашыць. За тое нехта яго не вельмі любіць, але большасць ставіцца з павагай. Бо гэты чалавек хоць і не дае камусьці жыць спакойна, але не забывае і падзякаваць. Нядаўна рабілі з ім матэрыял пра лесвіцу, якой актыўна карыстаюцца жыхары абедзвюх мікразон і па якой раней былі заўвагі. Дзякуючы актыўнасці старасты і пры садзейнічанні нашай газеты яе адрамантавалі. Аляксандр Пікуля з радасцю падзяліўся інфармацыяй, хто яму дапамагае ў яго не самай удзячнай рабоце і каму ён адрасуе свае падзякі.

План па зялёнай зоне на вуліцы Катоўскага жыхары адобрылі аднагалосна.

У чаканні пандусаў і шлагбаумаў

Нядаўна староста напісаў падзякі ў адрас двух прадстаўнікоў Магілёўскага гарвыканкама — начальніка ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян Лауры Дабрынскай і намесніка начальніка аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Ірыны Сталяровай. Яны дапамаглі вырашыць шмат розных праблем па вуліцы Падгорнай. Цяпер дапамагаюць там жа ўстаноўкай пандусаў да пешаходнай сцяжынкі, якая вядзе на мост па вуліцы Каралёва.

— Нам адрамантавалі лесвіцу, і гэта цудоўна, але ж тым, хто падымаецца на мост на веласіпедзе або з каляскай, больш зручна хадзіць па сцяжынцы, — тлумачыць ён. — Ёсць паразуменне з гарадскімі і абласнымі ўладамі (у прыватнасці, з упраўленнем па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Магілёўскага аблвыканкама ў асобе начальніка Іны Філіпавай, пра якую Пікуля кажа: залаты чалавек. — **«Зв.»**), спадзяюся, пандусы будуць зроблены.

Паралельна староста вырашае недапрацоўку па шлагбаумах у Падмікольскім парку, якія не працуюць. Па запрашэнні старасты, карэспандэнт «МС» асабіста пераканаласяў гэтым.

— Шлагбаумы тут не дзеля прыгажосці, імі рэгулюецца рух па вуліцы Малой Грамадзянскай і каля Падмікольскага манастыра, — паказвае ён адзін, на якім нават няма стралы. — Але, як бачыце, пакуль яны не працуюць і нават не ўсе ўкамплектаваныя.

Аляксандр Пікуля з надзеяй чакае вырашэння пытання, бо, як ён перыядычна паўтарае, ужо паведаміў пра гэта ў гарвыканкам.

«Пра гэты парк я марыў 45 гадоў...»

Пра парк у Падміколлі трэба сказаць асобна. Аляксандр Пікуля прызнаецца, што пра такі падарунак ён марыў 45 гадоў.

— У 1972 годзе праходзіў службу ў горадзе Іванава ў Расіі. Горад чымсьці падобны на наш. Толькі ў іх на той момант было чатыры паркі, а ў нас такога, які б цалкам адпавядаў свайму прызначэнню, ніводнага. Таму калі даведаўся, што ў нас у Падміколлі нарэшце зробяць парк, шэсць гадоў запар хадзіў на ўсе суботнікі і саджаў дрэвы, — кажа суразмоўнік.

Ён вельмі ганарыцца сваім першым дрэвам, якое пасадзіў на першым суботніку. Пра яго ведаюць дзеці і ўнукі. Яно трэцяе з краю цэнтральнай алеі. Па дарозе Аляксандр Пікуля не шкадуе моцных эпітэтаў, каб расказаць, што тут было да парку.

— Фактычна гарадская звалка, — кажа ён. — Усё баршчэўнікам зарасло, дрэвы хворыя былі, караедам пашкоджаныя, шмат якія з іх сохлі. Прыйшлося павыскаць. Лісце, хлам, смецце — самазвалы, напэўна, сотню рэйсаў зрабілі, каб усё гэта вывезці. Колькі суботнікаў тут правялі, нават цяжка падлічыць.

За парк Аляксандр Пікуля ўдзячны былому мэру Магілёва Уладзіміру Цумараву. Ён нарэшце ўзяў на сябе вырашэнне праблемы. І не толькі гэтай. «Пры Цумараве ўсе масты ў Магілёве адрамантавалі, — кажа староста. — А арка на ўездзе, якая з'явілася па ініцыятыве мэра, стала адным з цікавых архітэктурных аб'ектаў Магілёва».

Калі пачатак парку даў былы мэр горада, то яго напаўненнем і добраўпарадкаваннем займаецца сёння «Магілёўзелянбуд». Аляксандр Пікуля не пакідае адрасаваць свае падзякі дырэктару прадпрыемства Пятру Аляксейчыкаву, галоўнаму аграному Крысціне Аўтушковай і начальніку ўчастка парку Юрыю Макацарыю за тое, што парк становіцца з кожным днём прыгажэйшым, тут шмат кветак і малых архітэктурных формаў.

— Юрый Макацарыя наогул шмат робіць для добраўпарадкавання, бачыце, шпакоўні на кожным дрэве — гэта была яго задума, — паказвае Аляксандр Пікуля.

Ягадная алея

Па дарозе ад парку да нядаўна зробленага сквера Аляксандр Пікуля па-гаспадарску не забывае заўважыць, што, калі рабілі парк, дарогу па вуліцы Сурты разбілі цяжкай тэхнікай. Вырашыць пытанне з рамонтам, па яго словах, яму дапамагаюць вышэйназваныя Лаура Дабрынская, Ірына Сталярова і таксама начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Магілёўскага гарвыканкама Ігар Данькоў.

А вось і вуліца Катоўскага, пра добраўпарадкаванне якой мы калісьці таксама пісалі. Цяпер яе не пазнаць. Тут Падміколле мяжуе з Падгорнай, іх раздзяляе невялікая рачулка Дзебра, праз якую не без намаганняў Пікулі зроблены акуратныя масткі. А дапамагаў, удакладняе ён, Андрэй Маскалёў, які на той момант узначальваў гарадское ўпраўленне камунальнага будаўніцтва. Што датычыцца сквера, то пра зялёную зону стараста казаў яшчэ некалькі гадоў таму. Сёння і гэтая мара матэрыялізавалася. Непадалёк ад крамы і дзіцячага садка з'явіўся невялічкі сквер з саджанцаў рабіны, глогу, каліны — усяго 38 дрэў і столькі ж кустоў.

— Аграном «Магілёўзелянбуда» Крысціна Аўтушкова зрабіла праект, — удакладняе староста. — Вельмі прыгожы, мы яго яшчэ вясной абмяркоўвалі.

На пасадку сквера Аляксандр Пікуля запрасіў і жыхароў, самыя актыўныя з якіх шчыравалі наравне з камунальнікамі і прадстаўнікамі іншых зацікаўленых службаў.

Сквер знаходзіцца непадалёк ад дзіцячага садка, і староста ўспамінае добрым словам яшчэ і памочнікаў ад сістэмы адукацыі. Аператыўна вырашаць праблемныя пытанні з асвятленнем, добраўпарадкаваннем і гэтак далей на тэрыторыі дзіцячых садкоў і школ, дзе вучацца дзеці Падгорнай і Падміколля, яму дапамагаюць начальнік аддзела па адукацыі адміністрацыі Ленінскага раёна Магілёва Іна Казлова і галоўны спецыяліст гэтага ж аддзела — Ірына Сергеенка.

Асаблівасці Дзебранскага спуску

Мікразоны Падміколле і Падгорная знаходзяцца ў нізіне, і адзіная аўтамабільная дарога, па якой рухаецца грамадскі транспарт, — Дзебранскі спуск. Гэта таксама адно з праблемных месцаў. Якраз тут знаходзіцца гарадская бальніца хуткай медыцынскай дапамогі і заўсёды шмат жадаючых прыпаркавацца. Дарога ж вузкая і небяспечная. «МС» таксама неаднаразова пра тое пісала. У прыватнасці, пра прыпынак грамадскага транспарту, які тут знаходзіцца і да якога было цяжка пад'ехаць з-за вялікай колькасці прыватных аўто. Кіроўцам аўтобуса, якія абслугоўваюць маршрут № 39, Аляксандр Пікуля наогул рэгулярна піша падзякі. Гэта ж якія нервы трэба мець, каб лавіраваць у вельмі сціслай прасторы і вытрымліваць графік. Якраз з-за павароту вырульвае аўтобус, Пікуля глядзіць на гадзіннік і задаволена ківае галавой: хвіліна ў хвіліну па раскладзе.

— З аўтапаркам № 1 у нас поўнае паразуменне, — кажа суразмоўнік. — Нядаўна ў іх было прафесійнае свята, павіншаваў кіраўніцтва і асабіста кіроўцу, які абслугоўвае 39-ы маршрут. Дарога вузкая, і трэба быць вялікім прафесіяналам, каб працаваць без аварый.

Работа сапраўды цяжкая. Дзебранскі спуск — вельмі складаны ўчастак дарогі, асабліва зімой. Прычым не толькі для машын. Уздоўж дарогі цягнуцца металічныя парэнчы. Асабліва часта імі карыстаюцца жыхары зімой, у галалёд. Але чамусьці некалькіх пралётаў няма. Металісты ні пры чым. Гэта прыкладна чатыры гады таму камунальнікі праводзілі тут работы і забылі вярнуць парэнчы на месца. Але Пікуля нічога не забывае. І цяпер актывізаваў сваю дзейнасць і ў дадзеным напрамку. Заадно разважае, як зрабіць дарогу больш бяспечнай. Па абочыне разросся амерыканскі клён, які летам закрывае праезную частку. Сваю заклапочанасць староста ўжо выказаў гарадскім службам, якія кантралююць пытанне.

— Можна клён выразаць, а замест яго зрабіць кветнік і надпіс вялікімі літарамі — Падміколле. Павінна быць прыгожа і зручна для людзей, — лічыць ён.

А паркоўка дзе?

Заклапочанасць няўрымслівага старасты выклікае будаўніцтва, якое разгарнула аўтазаправачная станцыя ў раёне Дзебранскага спуску. Па яго звестках, замест мыйкі, якая тут была, плануюць зрабіць кавярню. Дальнабачны староста пралічыў, што будзе шмат наведвальнікаў на аўто і тое створыць дадатковую нагрузку на і без таго складаную дарогу. І ён мае рацыю. І гэта на павароце з вуліцы Карла Маркса на вуліцу Боткіна.

Месца не хапае нават для будаўнікоў.

Гэта шлагбаум. А дзе страла?

— Вунь нават вагончык будаўнічы на дарозе стаіць, — абураецца ён. — А што потым будзе, калі кавярня адкрыецца? Машыны і раней тут на газонах паркаваліся, а хутка яшчэ больш цесна стане. Я не супраць кавярні, але ж трэба ўлічваць і інтарэсы людзей.

Ён лічыць, што калі праект будзе рэалізаваны, усе аўто будуць стаяць на праезнай частцы. Бо тая паркоўка, што існуе, цалкам загружаная. Больш за тое, машыны пачалі паркаваць зноў ледзь не на прыпынку грамадскага транспарту. І гэта таксама непарадак.

— Пасля таго як мы з вашай газетай узнялі праблему, чатыры гады было ўсё нармальна, цяпер ізноў машыны стаяць уздоўж усёй дарогі, — скардзіцца Пікуля. — А тут яшчэ будаўніцтва. Дзе яны збіраюцца паркоўку рабіць? На гэтым пятачку ўжо няма вольнага месца.

Ёсць спадзяванні, што праблема ўсё ж такі вырашыцца да таго, як сапраўды паўстане. Мы ж абяцаем разам з актывістам з Падміколля адсочваць сітуацыю.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

«ЛЮДЗІ ЎБАЧЫЛІ ВЫНІК І ЗАЦІКАЎЛЕНЫЯ Ў НОВЫХ ІНІЦЫЯТЫВАХ»

Як у Гродзенскай вобласці месцічы здзяйснялі свае праекты

У рамках конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў у рэгіёне з'явілася 14 новых аб'ектаў і лакацый. У іх ліку — дзіцячыя і экалагічныя пляцоўкі, спартыўныя комплексы, аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны... У праектную дзейнасць актыўна ўключыліся ўсе раёны вобласці. Ініцыятывы выходзілі як ад асобных дэпутатаў, так і ад сельскіх Саветаў, грамадскіх арганізацый, іншых устаноў.

Акцэнт быў зроблены на вырашэнне сацыяльна значных пытанняў, рэалізаваць якія бяруцца самі грамадзяне. І ў гэтым галоўны сэнс конкурсу. Па словах **старшыні Гродзенскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатоля НІКІЦІНА**, стаяла задача прыцягнуць месцічаў да развіцця свайго краю, добраўпарадкавання тэрыторыі. А паколькі конкурс праходзіў упершыню, арганізатарам было цікава ўбачыць, што змогуць прапанаваць ініцыятыўныя жыхары вобласці.

— На конкурс паступіла 104 праекты, што сведчыць аб жаданні нашых жыхароў зрабіць штосьці карыснае для свайго кутка, той мясціны, дзе яны жывуць. Будзем спадзявацца, што з цягам часу ўсе гэтыя прапановы так ці інакш будуць рэалізаваны. Пакуль было вырашана абраць 14 праектаў, якія б дапамаглі вырашэнню сацыяльна значных пытанняў мясцовага ўзроўню, — растлумачыў Анатоль Нікіцін.

Сродкі выдзеліў Банк развіцця — у сярэднім па 7 тысяч рублёў на адзін праект. За паўгода практычна ўсе яны асвоены.

Акрамя таго, было вырашана падтрымаць і праекты, якія не ўвайшлі ў пераможцы. Іх аўтары могуць разлічваць на дапамогу ў іх рэалізацыі з боку мясцовых органаў улады.

Шмат хто з удзельнікаў конкурсу ўжо пачаў рэалізацыю сваіх праектаў. Напрыклад, у Шчучынскім раёне ў вёсцы Ласіца ўпарадкавана тэрыторыя, прылеглая да помніка ахвярам Чарнобыльскай катастрофы. Тут з'явіліся лаўкі, альтанка, дарожкі, пасадзілі дрэвы. Ініцыятыва належыць старшыні сельвыканкама Ларысе Ліс.

— Мы вырашылі, што ў нашай вёсцы, дзе жывуць і працуюць людзі, якія перажылі катастрофу, а таксама тыя, хто прыязджае сюды, павінна быць месца, дзе можна адпачыць, — расказала Ларыса Ліс.

Ініцыятыва старшыні сельвыканкама Ліс падтрымалі і ў суседнім Шчучынскім раёне. Тут у вёсцы Ласіца ўпарадкавана тэрыторыя, прылеглая да помніка ахвярам Чарнобыльскай катастрофы. Тут з'явіліся лаўкі, альтанка, дарожкі, пасадзілі дрэвы. Ініцыятыва належыць старшыні сельвыканкама Ларысе Ліс.

— Мы вырашылі, што ў нашай вёсцы, дзе жывуць і працуюць людзі, якія перажылі катастрофу, а таксама тыя, хто прыязджае сюды, павінна быць месца, дзе можна адпачыць, — расказала Ларыса Ліс.

За здаровы спосаб жыцця

Значная частка ініцыятыў накіравана на далучэнне грамадзян усіх узростаў да фізічнай культуры і здаровага спосабу жыцця.

Напрыклад, у аддзяленні дзённага знаходжання людзей сталага ўзросту раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Шчучынскага раёна набыты дадатковыя трэнажоры і спартыўны інвентар. Цяпер спартыўны гурток тут наведвае амаль 60 чалавек. У аддзяленні лічаць, што дзякуючы праекту пашырыцца кола аматараў актыўнага даўгалецця, палепшыцца іх здароўе.

З тэмай здароўя звязаны і праект па стварэнні ў ландшафтным заказніку «Гродзенская пушча» мінеральна-крынічнага парку. За сродкі фонду тут праведзены мерапрыемствы па ахове прыродных крыніц ад забруджвання. Пры падтрымцы Гродзенскага лясгаса добраўпарадкавана тэрыторыя, пракладзена дарожка, зроблены мосцік, каб зручна было набіраць крынічную ваду. Не забыліся стваральнікі праекта і пра эстэтычны выгляд. Побач з крыніцай установлены інфармацыйны стэнд і альтанка з драўлянай скульптурай, якую выканаў гродзенскі рэзчык па дрэве. У далейшым ёсць планы па арганізацыі турыстычных і краязнаўчых сцежак, веладарожак, назіральных пляцовак і зон адпачынку.

На здаровы спосаб жыцця скіраваны праекты ў аграгарадку Дзявяткавічы Слонімскага раёна і горадзе Гродна. Тут з'явіліся спартыўныя пляцоўкі для дзяцей і падлеткаў.

У Любчу на кірмаш

А вось у Любчы Навагрудскага раёна абсталявалі вясковы рынак для гандлю і культурна-масавых мерапрыемстваў. З такой ініцыятывай выйшаў **старшыня Любчанскага сельскага Савета Сяргей КАВЕЦКІ** сумесна з дэпутатам сельскага Савета Алегам Бедункевічам.

— Праект даўно выспяваў. У пасёлку няма месца, дзе можна было б разгарнуць сельскагаспадарчы гандаль. Раней мы рабілі тое на плошчы, перакрывалі вуліцы, што стварала нязручнасці для кіроўцаў, — расказаў Сяргей Кавецкі. — Нядаўна на плошчы знесены аварыйны будынак былога Дома быту. І на гэтым месцы якраз і з'явіўся рынак з агароджанай пляцоўкай. Цяпер тут не толькі кірмаш, але і месца правядзення розных культурна-масавых мерапрыемстваў. Да нас прыязджае шмат музычных калектываў. Цяпер ім будзе зручна выступаць, а слухачам — сабрацца іх паслухаць.

Адрасы «Дворыка дзяцінства»

Пры адборы праектаў у значнай ступені ўлічваліся інтарэсы дзіцячай аўдыторыі. Дзякуючы гэтаму была ўхвалена ініцыятыва па стварэнні дзіцячай пляцоўкі ў аграгарадку Гожа Гродзенскага раёна. Такую прапанову ў мясцовы сельвыканкам унеслі самі жыхары. І гэта зразумела. Населены пункт развіваецца, павялічваецца яго насельніцтва, расце колькасць дзяцей. Па словах **старшыні сельвыканкама Наталлі МАКАЎЧЫК**, пад індывідуальнае будаўніцтва генеральным планам прадугледжана выдзяленне яшчэ 60 зямельных участкаў. Адпаведна, будзе расці і колькасць маладых сем'яў. А вось сучаснай дзіцячай пляцоўкі ў аграгарадку не было. Таму сельвыканкам па ініцыятыве месцічаў выйшаў на конкурс менавіта з такім праектам.

— Мы назвалі наш праект «Дворык дзяцінства», — кажа Наталля Макаўчык. — Пляцоўка размясцілася побач са стадыёнам, які сёлета здадзены ў эксплуатацыю. Сродкі банка выкарысталі для ўладкавання інфраструктуры пляцоўкі, а вось дарожку да яе праклалі з дапамогай спонсараў. Жыхары аграгарадка таксама ўзялі ўдзел у добраўпарадкаванні і азеляненні тэрыторыі. У планах — дапоўніць пляцоўку гульнявымі канструкцыямі і зрабіць штучнае пакрыццё.

Старшыня сельвыканкама ўпэўненая, што жыхары і надалей не будуць чакаць, як хтосьці прыйдзе і штосьці зробіць, а гатовыя самі ўключыцца ў працэс. Напрыклад, тут мяркуюць працягваць «дзіцячую» тэматыку і прыняцца за мадэрнізацыю гульнявых пляцовак у дзіцячым садку, пабудаваным у 1970-я гады.

Яшчэ адзін праект з такой назвай рэалізаваны ў аграгарадку Дубна Мастоўскага раёна. Іх «Дворык дзяцінства» размясціўся ў самым цэнтры населенага пункта, у паркавай зоне, што вельмі зручна для наведвальнікаў.

— Раней у нас не было дзіцячай пляцоўкі, таму вырашылі абсталяваць гэты аб'ект больш грунтоўна. Для рэалізацыі праекта дадатковыя сродкі былі выдзелены райвыканкамам. У выніку з'явілася сучасная пляцоўка з арэлямі, горкамі, пясочніцай, прыгожымі лаўкамі, — расказаў **старшыня Дубненскага сельвыканкама Анатоль ЛІС.**

З акцэнтам на гісторыю

Цікавы праект ажыццявілі ў Астраўцы. На конкурс яго прапанавала гімназія № 1. Ініцыятыва скіравана на захаванне вежы на востраве ў аграгарадку Варняны, якая з'яўляецца аб'ектам гісторыка-культурнай спадчыны. Апошнім часам гімназісты ладзяць там тэатралізаваныя экскурсіі, дзе расказваюць аб гісторыі і асаблівасцях гістарычных мясцін свайго краю. Такія экскурсіі нават выклікалі інтарэс з боку турыстычных кампаній. Але сама вежа патрабавала добраўпарадкавання. Праект аказаўся ў ліку пераможцаў. Да працэсу падключыліся спонсары і мясцовыя жыхары. Цяпер, лічаць у гімназіі, аб'ект набудзе яшчэ большую прывабнасць у рамках распрацаванага турыстычнага маршруту «Залатое кола Астравеччыны».

З акцэнтам на гісторыю, але ў сучасным выкананні рэалізаваны праект па аднаўленні былога парку Сапегаў у аграгарадку Дзярэчын Зэльвенскага раёна. Ініцыятыву мясцовых улад падтрымалі жыхары, якія цяпер могуць адпачыць у новых альтанках, палюбавацца архітэктурнымі формамі, пазаймацца на спартыўнай пляцоўцы. Усё гэта стала магчымым дзякуючы ўдзелу ў праекце і намаганням саміх месцічаў.

***

Як адзначыў старшыня абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатоль Нікіцін, асацыяцыяй праводзяцца адукацыйныя семінары, якія дапамагаюць знайсці тэму для праектаў і забяспечваюць іх кампетэнтнае суправаджэнне. Але варта разумець, што сутнасць самакіравання ў тым, каб самастойна выяўляць праблемы і знаходзіць шляхі іх вырашэння. Гэта павінна актывізаваць грамадскасць на партнёрскае ўзаемадзеянне з дзяржавай, лічыць Анатоль Нікіцін. Па яго словах, такія конкурсы мяркуецца праводзіць штогод. Дарэчы, сёлета рашэннем аблвыканкама для падтрымкі мясцовых ініцыятыў створаны абласны фонд у памеры 200 тысяч рублёў. Яго пераможцамі сталі чатыры праекты, самым буйным з якіх з'яўляецца будаўніцтва паркавай зоны ў адным з новых мікрараёнаў Гродна. Сёння там актыўна вядуцца работы.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота дадзены Гродзенскай абласной асацыяцыяй Саветаў дэпутатаў.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 8 лістапада 2022 года.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 12 декабря 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34612**, площадью **3 453,9 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 8**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-8	**415 031,45**	20 751,57
2	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34622**, площадью **9 151,1 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 14**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-14	**1 018 373,80**	50 918,69

Продавец: ОАО «БЕЛФА», г. Жлобин. 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (044) 797-88-07, заместитель директора по техническим вопросам – Галактионов Виктор Владимирович.

Шаг аукционных торгов – 5 %.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 9 ноября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 8 декабря 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by/** в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

Предоставляется рассрочка платежа для лота № 2 в соответствии с действующим законодательством РБ.

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 23 ноября 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 40 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

3	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14328**, общей площадью **692,4** кв. м, назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на восемь транспортных единиц** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание гаража на восемь транспортных единиц). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/10, гараж. **Условие продажи:** после проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка**, необходимого для обслуживания предмета аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Покупателя (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100003004080** общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, гаража на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9. **Капитальное строение с инв. № 320/С-38833** общей площадью **4 241,6 кв. м**, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **участок автодорог для обслуживания транспортного цеха** (составные части и принадлежности: А-автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2, территория ОАО «Белфа» г. Жлобина. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100003004080** общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9	**259 200,00**	12 960,00

Продавец: ОАО «БЕЛФА», г. Жлобин. 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (044) 797-88-07, заместитель директора по техническим вопросам – Галактионов Виктор Владимирович.

Шаг аукционных торгов – 5 %.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 9 ноября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 21 ноября 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи.

Предоставляется рассрочка платежа для лота № 3 в соответствии с действующим законодательством РБ.

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Новое житье» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

ЗДАНИЯ СЕЛЬСКОГО КЛУБА

(составные части и принадлежности: 2 (две) кирпичные веранды, 2 (две) кирпичные пристройки, сарай, 3 (три) бетонных крыльца)

с инв. № 623/С-51036 общей площадью 226,6 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625682108101000045 площадью 0,2753 га (право постоянного пользования), по адресу: Минская область, Узденский район, Неманский с/с, д. Прусиново, ул. Школьная, 6.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0517 га.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 8 280,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены **– 828,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330 000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015,ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901,код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **12.12.2022** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.12.2022** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.
Тел. для осмотра: 8 (01718) 63 4 65, 8 (029) 865 97 20.

УНН 690032361

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мирополье» (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ СКЛАДА

с инвентарным номером № 610/С-64242 общей площадью 958,5 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620887408901000081 (право аренды по 06.12.2071) площадью 0,2636 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, д. Тимки, ул. Центральная, 6А.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0081 га.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 29 473,64** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены **– 2 947,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015,ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **12.12.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.12.2022** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.
Тел. для осмотра: 8 (01777) 91 8 03, 8 (044) 555 25 91.

УНН 600134385

16.11.2022 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня:

1. Об изменении размера уставного фонда общества.

О внесении и утверждении изменений в устав ОАО «Гомельжилпроект».

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 04.11.2022 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Дата сбора реестра акционеров – 04.11.2022 г.

Наблюдательный совет.

УНП 400022625

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» 24 ноября 2022 в 14.00 проводит повторные торги по продаже следующих объектов

№ п/п	Наименование объекта продажи	Начальная цена продажи снижена на 30 % и составляет с учетом НДС 20 %, белорусских рублей	Задаток, белорусских рублей
Лот № 1	**Комбайн «Holmer Terra DOS T3»,** заводской номер 3118, инвентарный номер 866Т, 2012 года выпуска, регистрационный знак ТВ-6 1742, цвет красный	189 840,00 (сто восемьдесят девять тысяч восемьсот сорок рублей 00 копеек)	18 984,00 (восемнадцать тысяч девятьсот восемьдесят четыре рубля 00 копеек)

Собственник имущества: ОАО «Горецкая райагропромтехника», 213408, г. Горки, Республика Беларусь, Могилевская обл. ул. Железнодорожная, 39, УНП 700100784, тел. для осмотра объекта продажи: (02233) 49-602, 49-207.

Организатор торгов: унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

Место проведения торгов: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком.

Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilev.cci.by.

Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты предмета торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся 24 ноября 2022 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104.

Последний срок подачи заявления – 23 ноября 2022 г. до 12.00.

Регистрация участников торгов: 24 ноября 2022 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 104, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП». Телефоны для справок: (0222) 778042, +375296927492 (А1).

Извещение о предыдущих торгах по объекту было размещено в газете «Звязда» от 11.08.2022, 07.10.2022.

Хто каго?

«Абяцаў Іванка Раі: Будзеш жыць са мной у раі!..»

З анекдотаў, вершаў, быліц, постаў — з чаго толькі не пачыналіся агляды нашай конкурснай пошты!

З прымавак, здаецца, не? Такім чынам (яшчэ Далем заўважана!): баба, пакуль з печы ляціць, семдзесят сем дум перадумае.

Мужчына часам таксама. Ну вось уявіце: вечар, маршрутка, два пасажыры. Адзін — моцна стомлены — раней часу з камандзіроўкі вяртаецца, але ж другога бачыць, думае, куды гэта той (ды бадзёры такі!) можа ехаць? З работы — як быццам позна, па справах — таксама. Няйначай да жанчыны?!

У нашым баку, — ён думае далей, — іх тры: Сара, Мара і жонка мая. Першая з іх у санаторый паехала (сам на вакзал падвозіў), другая — на ковід хварэе. Застаецца трэцяя, жонка...

У яе, разважае муж, палюбоўнікі ёсць, наколькі ведаю — тры: яе начальнік, мой начальнік і Лёва, пра якога я толькі чуў. Значыць, трэба падысці (мужчына і сапраўды падымаецца з месца, папраўляе гальштук), кажа незнаёмцу: «Добры вечар, Лёва! Рады з вамі сустрэцца». — «А вы, прабачце, адкуль мяне ведаеце?» — не разумее спадарожнік. — «Вылічыў».

Тое ж — хай зрэдку — але робіць «Звязда»: перш-наперш змяшчае здымак, просіць чытачоў прыдумаць подпісы і даслаць у рэдакцыю, потым, праз месяц-другі, у такіх вось аглядах друкуе самыя цікавыя варыянты, для таго каб нарэшце выбраць найлепшы. У мінулы раз, напрыклад...

Зрэшты, не будзем забягаць наперад — лезці раней бацькі ў пекла, бо на здымку ж — Рай! На зямлі... Адкуль?

Як заўжды: колькі людзей, столькі думак. Як лічыць **спадар Віктар Сабалеўскі з Узды:**

Хтось жыве ў Зялёных Борках,
Ёсць Лагчына і Вярхі,
Вёскі Марс, Парыж і Зорка...
Ёсць і наша... Трыбухі.
Нечакана, непрыгожа...
Ясь не кінуўся ў адчай:
Не пытаўся, нельга, можна,
А павесіў шыльду — Рай.

І тым самым, відаць, многіх уцешыў. І многіх... напужаў. Ну вось уявіце (з падачы **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска):**

Колькі жыў на гэтым свеце,
Шчыра ў бога верыў Пеця.
Ганьба мелася адна:
Дрэнна цяміў з бадуна.
Вось і тут ён не дапёр:
Ці жывы? Ці ўсё ж памёр?

І сапраўды, дзіўная назва ў гэтай вёсцы. Хто прыдумаў, чаму?

Ёсць меркаванне, што там жылі аптымісты: пачулі аднекуль, што «Як вы лодачку назвалі, так яна і паплыла», і паспрабавалі — з новым імем спусцілі на ваду. Цяпер (паводле **спадара Сабалеўскага**) — хіба чакаюць:

Ясь дастатку век не знаў,
Абышло й каханне...
Але ж вёску так назваў.
Хай жа рай настане!

Сужэнцы Астроўскія з Мінска ведаюць, дарэчы, калі тое можа стацца:

Быццам чэрці людства носяць,
Аж пакуль не сыдзе восень.
А сабралі ўраджай, —
Вось тады у вёсцы рай!

Што праўда, тое праўда: работы мала, паветра чыстае, цішыня, цеплыня (у маразы можна «лішні» раз у печцы пратапіць). А калі да гэтага ў гаспадарцы свая кароўка, свінні, куры, склеп з гародніна... Жыві і праблем не ведай! Праўда, папярэдне... папрацуй.

«Увосень работ восем, а то і больш, — піша **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавіч.** — Але ж калі не сядзіш склаўшы рукі, не вохкаеш, што цяжка, што ўсё баліць, не псуеш сваё здароўе, кукам седзячы каля тэлевізара, то паціху-памалу ўсё і паробіш. Я ў сезон толькі цямком у хату прыходжу. Мама (светлай памяці!) раіла сярод градак тапчан паставіць, каб там начаваць. А я і не супраць была б, бо на свежым паветры так лёгка дыхаць, так добра працаваць...».

І думаць, між іншым, таксама. Ад яе, ад **спадарыні Валянціны,** дасціпнае:

Угаворваў Дзіма Фроську:
— Пераедзем жыць у вёску!
Дзеўка
ўсё вагалася —
Доўга не згаджалася...
А сказаў: махнём у Рай!
Фрося тут жа:
— А давай!

Не намі заўважана: жанчыны кахаюць вушамі, мужчыны — вачыма. У абодвух выпадках — поўная адсутнасць работы мозга.

Сведчаннем таму радкі **спадарыні Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны:**

Абяцаў Іванка Раі:
— Будзеш жыць са мной у раі!
Што для гэтага зрабіў?
Шыльду ля двара прыбіў.

Трэба разумець, падмануў?

З дыялогу мужчын: «Я сёння — герой!.. Адну маладзіцу ад згвалтавання выратаваў». — «Праўда? Як?!» — «Ды ўгаварыў». (Перафразуючы: «Доўга хлусіць дзяўчыне, што ты мільянер, напэўна, не ўдасца, але ж доўга і не трэба». Галоўнае, каб потым...)

Парада — ад **спадарыні Гудачковай:**

Мала шыльду напісаць,
Трэба справай даказаць,
Што не зломак, не гультай,
Што сям'і збудуеш рай.

І знойдзеш за што — няхай не ў мільённых памерах.

Прызнанне хлапчука: «Са мной так бывае: збіраю-збіраю грошы на «мерседэс», а потым сарвуся і куплю шакаладку».

Прызнанне дарослага дзядзькі: «Раней я любіў лета, але потым зразумеў, што, маючы грошы, яно можа быць хоць калі: восенню, зімою, вясной... Так што цяпер я люблю грошы».

І каб толькі!.. А то ж заўважана, што дзяўчаты, жанчыны і сапраўды чакаюць прынцаў на белым кані. Мужчыны — яны больш сціплыя: ім дастаткова служанак.

Праўда, не ўсім. І не кожная на такую «службу» пагодзіцца. Як піша **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў:**

Разумею я Адама:
Ну які без Евы рай?
Толькі Ева — тая дама:
Ёй палацы падавай!
Збавіць ночку ў шалашы?
Хіба зрэдку... Для душы.

(Іншы варыянт канцоўкі:
...А ў нейкім будане —
Гэта, людцы, не па мне!)

І да абодвух — проза: «Свае літаратурныя вопыты я заўсёды правяраю на блізкіх, — прызнаецца **спадар Валерый.** — На гэты раз дачка з зяцем у госці прыехалі. Яна — выпускніца філфака БДУ, ён таксама шчыры беларус... Так што апошнія радкі ў гэтым вершы прыдумалі разам.

З тога ж канверта, ад той жа сям'і, і працяг:

Прапануйма Соні, Раі:
«Будзеш жыць са мной у раі?»,
Розум тут жа адымае:
Ні адна не запытае,
Дзе той край?
І што за рай?
Мо зірнеш
і уцякай?

Пра тое ж, але іншымі словамі піша **спадарыня Чыгрынава:**

Як убачыў шыльду Косця,
Ажно сэрцайка зайшлося:
Пабудую тут даміну,
Прывяду ў яе дзяўчыну...
Рот, браток, не разявай:
Не паедзе краля ў Рай.

Трэба разумець, скончыўся час дзекабрыстак? Але ж, на думку **спадара Гаўрыша,** цуды часам здараюцца:

Са сталіцы у... адрыну
Ясь прывёз сваю Яніну.
Цалаваў
аж да світання,
Аж да шчырага
прызнання:
— Больш я ў горад —
ні нагой:
Застаюся тут, з табой!

...Вось такая перамена!
Вось што робіць водар сена!

А ўжо як надоўга...

Што было — было: пасля смерці адзін чалавечак у рай патрапіў. І жыў бы ды жыў, каб не чэрці: аднаго разу прыехалі, у вушы ўвялі, што сумна тут, а вось у пекле... З'ездзі, маўляў, і сам паглядзі, знаёмых сустрэнеш...

Адпрасіўся дзядзька ў бога — махнуў на экскурсію. Тры дні пажыў, і так яму спадабалася! Ведама: кампаніі, музыка, піва, дзяўчаты... Пераехаў туды назусім: толькі за парог ступіў, ці не тыя ж чэрці пад пахі яго і ў смалу, у кацёл. Дзядзька ў лямант: «Стойце! Тут нейкая памылка! Я ж іншае бачыў, калі на экскурсіі быў!» — «Дык турызм, — яму кажуць, — гэта адно, а пераезд — зусім другое».

Кожны выбірае па сабе і потым...

Заўвага ад **сужэнцаў Астроўскіх:**

Каб не тыя Віскулі,
У камунізме пажылі б,
Як паны, у светлым раі...
Дый...
Што маем, тое маем.

Адзінае — на суцяшэнне сабе — ведаем (а **спадар Мікалай Камароўскі з Оршы** піша):

Ёсць ён — рай!
І я б там жыў!
Калі б часам не грашыў
На дурную галаву...
Вось у пекле і жыву.

Пра тое ж **сужэнцы Астроўскія:**

Пасля смерці —
ў рай, да бога,
Пратаптаная дарога:
Ды калі грахі аблогай...
Значыць, братка, выбачай:
Для цябе закрыты рай.

А яно ж, бывае, не верыцца. Мужчынку аднаго каля брамы спынілі: далей — ні кроку, бо не заслужыў, маўляў, за ўсё жыццё нічога добрага не зрабіў. «Як так? — абураецца дзядзька. — Я ж тры пункты выканаў: дрэва пасадзіў, дом пабудаваў, сына нарадзіў...» — «Але ж усё гэта — адным інструментам, а трэ было рознымі...»

Слушная заўвага ад **спадара Мікалая Старых з Гомеля:**

Каб мець райскія даброты,
Не цурайся, брат, работы.
Калі ж бездар і гультай,
Нават «адрас» не пытай!

А ў ім, тым адрасе можа быць не толькі Рай. На думку **спадара Мікалая Камароўскага з Оршы:**

Назвалі вёсачку — Парыж.
(Няйначай,
каб падняць прэстыж?)
Венера ёсць, Нептун і Марс...
Ды
райскага жыцця няма ж...
Захочаш раю,
Будзе Рай:
На паказальнік пазірай.

Незразумела толькі, гэты чалавек на здымку мацуе яго да слупка, альбо...

Як лічыць **спадарыня Любоў Чыгрынава:**

Быў на сёмым небе Пеця:
Бачыў рай!
На гэтым свеце!
Азірнуўся небарака —
Ані хатачкі ніякай...
Стала вусцішна і млосна:
Дзе ж ты, дзе,
былая вёска?!

А яна, між іншым, на думку **спадарыні Валянціны Гудачковай:**

І была тут, і гула...
З жыхарамі
адышла:
Ні душы больш не відаць,
Дык і шыльду трэба зняць.

Але ж, будзем спадзявацца, не для таго, каб выкінуць: каб потым, прычым абавязкова, недзе прымацаваць, і каб тады ўсе чыста (разам са **спадаром Эльяшам Банелем з Мінска**) убачылі:

Хлопец шыльду прыбівае:
Вось ён, тут,
пачатак Раю!
Я, дурны, раней не знаў,
Куляй міма пралятаў.
Але ж выпісаў «Звязду»
І цяпер — ужо знайду!

Вось на гэтай прыгожай ноце можна б і завяршыць чарговы агляд, але ж трэба вярнуцца да папярэдняга. Тады (гл. нумар «Звязды» за 21.09 гэтага года) на здымку быў мужчынка-працаўнік — з канём і сабакам: сена складаў на воз, а ўжо каму...

Розныя былі меркаванні. Найцікавейшыя, паводле вялікага чытацкага журы, у **спадарынь Любові Чыгрынавай з Мінска і Войцік з Гродна, у мінчан сужэнцаў Астроўскіх з Мінска, у спадароў Віктара Сабалеўскага з Узды і Мікалая Камароўскага з Оршы.**

Вось з гэтым, апошнім меркаваннем, згадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае, што азначае адно: прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на першы квартал 2023 года накіроўвецца ў Оршу.

Хочаце, каб газета (родная на роднай мове!) пяць разоў на тыдзень прыходзіла да вас, тады варыянтаў два: альбо аформіць падпіску, альбо ўважліва паглядзець на чарговы конкурсны здымак, размешчаны ўнізе, прыдумаць да яго подпіс (можна некалькі, але трапных, дасціпных, кароткіх — не больш за восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю. Шанц на выйгрыш мае кожны. Поспехаў!

Валянціна ДОЎНАР.

АД ЯЕ Ж шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі гэтым разам не прайшлі строгага конкурснага адбору. Затое наступным...

Пішыце!



Фота Анатоля КІЦІНЧУКА.

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

ЧЫМ НЕБЯСПЕЧНЫ НАСМАРК?

НАСМАРК з'яўляецца самым распаўсюджаным захворваннем верхніх дыхальных шляхоў. Гэта звычайная з'ява пры вострых рэспіраторных вірусных захворваннях. Банальны насмарк або востры неспецыфічны рыніт складае вострае запаленне слізістай поласці носа.

ФАКТАРЫ, ЯКІЯ СПРЫЯЮЦЬ РАЗВІЦЦЮ НАСМАРКУ

Гэта пераахаладжэнне, зніжаная імунная ахова арганізма, кантакт з хворымі на вострыя вірусныя рэспіраторныя захворванні, такія як парагрып, грып, адэнавірус і іншае, а таксама ўнясенне ў насавую поласць патагенных мікраарганізмаў.

ЯК РАЗВІВАЕЦЦА ЗАХВОРВАННЕ?

Яно праходзіць тры стадыі:

I стадыя — рэфлекторная, калі назіраюцца першыя праявы (або стадыя сухога раздражнення). Яе працягласць некалькі гадзін. Адзначаецца расшырэнне сасудаў слізістай абалонкі носа, яе гіперэмія, сухасць. Паталагічнага выдзялення ў насавых хадах няма. Рэзка ўзнікае сверб, смыленне слізістай, казытанне ў носе, чханне. Часта назіраецца ўздым тэмпературы цела да 38 С°, галаўныя болі, агульная слабасць, млявасць, недамаганне.

II стадыя — катаральная. Цягнецца некалькі гадзін ці сутак. Сасуды пачынаюць расшырацца, слізістая становіцца ацёчнай. Гэты фактар і шматлікія серозна-слізістыя выдзяленні з поласці носа выклікаюць цяжкасці насавога дыхання, парушэнне тэмбру голасу. Церпіць і нюхальная функцыя, што цягне за сабой парушэнне функцыі ўспрымання смаку. Магчымыя пачырванненне і ацёк слізістай і скуры пад носам з-за раздражняльнага ўздзеяння аміяку, які знаходзіцца ў вялікай колькасці ў серозна-слізістых выдзяленнях. Часам насмарк выклікае запаленне слізістай вачэй — кан'юктывіт, слёзацячэнне, шум і закладзенасць у вушах.

III стадыя — папраўка і аднаўленне функцыянальных здольнасцяў слізістай абалонкі носа, прыпадае на 4-5 дзень захворвання. У гэты час бурна размнажаецца патагенная і ўмоўна патагенная мікрафлора, узмацняюцца ахоўныя механізмы арганізма. У выдзяленнях з'яўляюцца лейкацыты, макрафагі, што клінічна праяўляецца зменай характару і колеру: спачатку вадкія і зусім празрыстыя, пасля становяцца гнойнымі, густымі і змяняюць колер на жоўта-зялёны. Знікаюць ацёчнасць і пачырваненне. Аб'ём выдзяленняў павольна зніжаецца, поласць носа вызваляецца ад слізі і аблягчаецца насавое дыханне.

ЦІ ВАРТА ЛЯЧЫЦЬ НАСМАРК?

— Існуе шырока распаўсюджанае памылковае меркаванне сярод насельніцтва аб немэтазгоднасці лячэння вострага рыніту: лячы ці не лячы, ён сам за тыдзень пройдзе. Аднак часам пацыентам, якія кіруюцца такім сцверджаннем, даводзіцца сутыкацца з ускладненнямі банальнага насмарку ў выглядзе запалення каляносавых пазух і сярэдняга вуха, ніжэйшых дыхальных шляхоў — фарынгалярынгатрахеабранхіту, а таксама хранізацыяй вышэйпералічаных працэсаў, — тлумачыць **урач-педыятр, загадчык 3-га педыятрычнага аддзялення 3-й мінскай дзіцячай клінічнай паліклінікі Людміла КІПЦЭВІЧ.**

Пры своечасовым і правільным лячэнні захворванне доўжыцца ад 7 да 10-12 дзён.

Важна ведаць, да чаго можа прывесці парушэнне насавога дыхання на фоне частага насмарку ў дзіцячым узросце. Гэта парушэнне сну, хуткае ператамленне, зніжэнне памяці, парушэнне работы органаў дыхання і сардэчна-сасудзістай сістэмы, парушэнне працэсаў метабалізму, спыненне фізічнага і разумовага развіцця дзіцяці, дэфармацыя тварнага шкілета. Таму вельмі важна своечасова звярнуцца па дапамогу да педыятра або атарыналарынголага.

Лячэнне вострага рыніту на кожнай стадыі адрозніваецца.

На I стадыі захворвання яно ўключае адцягвальныя працэдуры (нажныя ванны, расціранне ног), патагонныя сродкі (гарбата з малінай, мёдам, ліпавым цветам), фітанцыды (удыханне здробненага часнаку, цыбулі), прызначэнне гарачкапаніжальных прэпаратаў, антыгістамінаў, прымяненне супрацьвірусных прэпаратаў (аксалінавая мазь, інтэферон).

У II стадыі варта прыняць меры, накіраваныя на памяншэнне эксудацыі. З такой мэтай працягваюць прыём антыгістамінных прэпаратаў, далучаюць пратарголавыя або колларголавыя кроплі ў нос, альбуцыд.

Як у II, так і ў III стадыі неабходна дадаць да лячэння сасудазвужальныя кроплі ў нос або спрэі. Яны звужаюць сасуды, якія забяспечваюць крывёю слізістую носа. Гэта прыводзіць да памяншэння ацёчнасці і дапамагае нармалізаваць дыханне збольшага ці цалкам.

— Многія памылкова думаюць, што масляныя кроплі бяспечныя і іх можна ўжываць калі заўгодна. Але гэта не так. Па-першае, яны прымяняюцца толькі пры атрафічных насмарках (калі ў носе дзіцяці сухія скарыначкі). Па-другое, дзецям да 3 гадоў нельга ўжываць у нос прэпараты ментолу, бо яны могуць выклікаць ларынгаспазм і нават сутаргі, — папярэджвае ўрач.

У III стадыі выкарыстоўваюць мясцовыя антыбіётыкі ў выглядзе кропель або спрэяў.

ТАТУІРОЎКА: ЖЭСТ ДЗЕЛЯ ЖЭСТА?

Упрыгажэнне, самарэалізацыя ці прыкмета прымітыўнай культуры

Па статыстыцы, 50 % людзей, якія ўпрыгожылі сябе татуіроўкай, прымаюць меры па яе выдаленні на працягу 10 гадоў. Колькі тых, хто шкадуюць аб нанесенай татуіроўцы, але не робяць гэтыя працэдуры з прычыны даволі высокага іх кошту, дарэчы, значна вышэйшага, чым нанясенне тату нават у добрым салоне, на жаль, невядома.

Вядома, як і ўсякая мода, з часам татуіроўка можа страціць сваю папулярнасць. Насамрэч, ці можна чакаць, што любімыя джынсы, кашулю, сукенку ці чаравікі мы будзем насіць да канца сваіх дзён? Вядома ж, стылі, фасоны і колеры мяняюцца. Але татуіроўку не зменіш, як адзенне. Да таго ж тое, што мы лічым класным у 18 гадоў, у 30 гадоў можа такім ужо не здавацца.

Пра феномен і папулярнасць татуіровак у сучасным свеце з псіхалагічнага пункту погляду мы пагутарылі з псіхолагам вышэйшай катэгорыі Мінскага гарадскога клінічнага цэнтра псіхіятрыі і псіхатэрапіі Ганнай САЛАВЕЙ.

— Ганна Ігараўна, у апошняе дзесяцігоддзе татуіроўка стала вельмі масавай з'явай...

— Мода на татуіроўкі зусім не новая — гэта адзін са старажытных метадаў аздаблення свайго цела. Як і ўсякая мода, гэтая таксама схільная да прыліваў і адліваў. Сапраўды, за апошнія дзесяць гадоў яна ператварылася з табуіраванага элемента ў частку культуры і атрымала масавае ўвасабленне.

Адна з версій аб паходжанні гэтага тэрміна кажа аб тым, што на таіцянскай мове (астравы Палінезіі) «тату» азначае «пазначаць, маркіраваць». Гэтае слова прывёз у Еўропу мараплавец Джэймс Кук. Трэба адзначыць, што тры сусветныя рэлігіі (хрысціянства, мусульманства і іўдаізм) негатыўна ставяцца да працэсу татуіравання. Таму доўгі час дадзеная з'ява не мела шырокага распаўсюджання.

Аднак сучасная татуіроўка можа наносіцца не толькі з этнічнарэлігійных ці крымінальных матываў, але і адлюстроўваць індывідуальнасць яе носьбіта, значныя падзеі, асабістыя перажагі, прыналежнасць да спартыўнага клуба, музычнай або палітычнай плыні, далучэнне да канкрэтнай нефармальнай групы і іншае.

Гісторыя татуіроўкі пачалася больш за пяць тысяч гадоў таму. У першабытным грамадстве татуіроўкі выкарыстоўвалі як сімвал прыналежнасці да роду, племені або для абазначэння сацыяльнага статусу. Па малюнку на скуры можна было зразумець, хто перад табой: воін ці паляўнічы, павадыр ці ізгой. Пазней татуіроўкі сталі выкарыстоўваць як абярэгі ці частку абраду, напрыклад пры пасвячэнні хлопчыка ў мужчыны.

Доўгі час татуіроўкамі валодалі толькі абраныя, асаблівыя людзі. Але ў 1891 годзе ўсё змянілася. Самюэль О'Рэйлі стварыў першую машынку для татуіроўкі, тады ж гэтая дзейнасць ператварылася ў бізнес і спосаб забавы.

— Аднак чаму менавіта сёння да яго звяртаюцца ўсё часцей?

— Татуіроўка ў сучасным свеце — гэта перш за ўсё выказванне. Тое, што людзі выкарыстоўваюць для гэтага такі неардынарны спосаб, азначае, што выказванні, якія можна зрабіць іншымі спосабамі, не падаюцца ім дастатковымі.

Відавочна, што ўзрасла сама патрэбнасць у выказванні. Цяпер нас з дзяцінства вучаць, што мы з'яўляемся нечым асаблівым і значным. І сёння многія не хочуць быць часткай аднастайнай масы, а наадварот, жадаюць вылучыцца, заявіць аб сабе. Татуіроўка з'яўляецца вельмі зручнай формай падобнай заявы. Не трэба нешта даказваць ці здзяйсняць, прыкладаць намаганні для таго, каб данесці зробленае ці інфармацыю аб тым, што ты зрабіў. Нарэшце, не трэба турбавацца аб захаванасці дасягнутага выніку. Татуіроўка заўсёды з табой, яна заўсёды даступная ўспрыманню навакольнымі.



Татуіроўка — візуальны аб'ект. І сёння міжволі ідзе пераразмеркаванне інфармацыі на карысць каналаў камунікацыі, арыентаваных на зрок. Перадачы падлягаюць выявы, а не словы. Выявы ж разлічаныя на іх эмацыянальную апрацоўку. Сучасны чалавек усё больш рухаецца ў бок эмацыянальнасці, а рацыянальнае губляе былое значэнне.

— Відавочнае і значнае павелічэнне колькасці жаночых татуіровак. З чым тое звязана?

— Некаторыя мужчыны, з якімі я абмяркоўвала гэтую тэму, лічаць, што татуіроўка з'яўляецца маркёрам магчымых псіхалагічных праблем. І калі якія-небудзь ластаўка ці матылёк могуць успрымацца яшчэ нейтральна, то дэталёва прапрацаваная інфернальная карціна на перадплеччы, спіне ці сцягне палохаюць. Акрамя таго, мужчыны часта кажуць, што жаночая татуіроўка ўспрымаецца як «бруд».

Становішча мужчыны ў сучасным свеце, па сутнасці, не змянілася. Ён як выходзіў на барацьбу з асяроддзем, так можа гэта рабіць і сёння. Змянілася тое, што раней за мужчынам, як правіла, была сям'я, а цяпер можа не быць нікога, і ўвесь яго канфлікт з асяроддзем выкліканы рэалізацыяй толькі яго ўласных інтарэсаў. Але пры гэтым спосаб яго дзеянняў у цэлым захоўваецца, яму ўсё знаёмае і ён пачуваецца ўпэўнена.

З жанчынай усё крыху па-іншаму. Мадэль яе светабудовы зведала больш істотныя змены. Прыгожыя цэтлікі, павешаныя на гэты працэс — эмансіпацыя, барацьба за правы, — не могуць схаваць недасканаласці новага становішча: яна павінна імітаваць мужчыну, фізіялагічна і псіхалагічна не будучы ім. Адсюль няўпэўненасць і павышанае эмацыянальнае напружанне. Жанчыне даводзіцца прыкладаць дадатковыя намаганні, каб заставацца ў рамках новага вобраза, не даючы сабе вярнуцца да ранейшай, традыцыйнай мадэлі. У гэтыя намаганні ўваходзяць і тату: імі жанчына дэманструе самадастатковасць, сцвярджаючы, што яна валодае неабходным узроўнем свабоды, каб распараджацца сабой па ўласным жаданні.

Калі паслухаць саміх дзяўчат, можна вылучыць некалькі асноўных матываў нанясення татуіроўкі. Некаторыя робяць гэта для самавыяўлення. Іншыя сцвярджаюць, што «маюць права» рабіць са сваім целам што заўгодна. Вядома, уплывае і мода на тату. Як існуе і матыў аздаблення цела. Аднак на гэтыя выклікі можна было б адказаць і інакш. Чаму ж выбіраецца адказ менавіта ў выглядзе тату? Ці не таму, што іншыя адказы аказаліся менш даступныя?

Увогуле, з культуралагічнага пункту гледжання варта адзначыць, што татуіроўка прысутнічае ў дастаткова прымітыўных культурах. А колькасць людзей, гатовых задавольвацца прымітыўнай культурай, на жаль, расце.

Калі чалавек сутнасна пасіўны, ён дзейнічае з найменшымі выдаткамі энергіі. Самарэалізацыя ў выглядзе тату стала масавай менавіта таму, што гэты спосаб патрабуе найменшых намаганняў пры дасягненні відавочнага для ўсіх выніку. Тым людзям, якія гатовыя духоўна працаваць, татуіроўка не патрэбная. Іх рэалізацыя будзе і без таго поўнай, у ёй проста не застанецца месца для жэстаў дзеля жэста, да якіх адносіцца і тату.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
на право заключения договора аренды земельного участка в г. Жодино

Место расположения земельного участка и кадастровый номер	**Земельный участок, расположенный в микрорайоне «Новые Грядки» по ул. Новогрядской в г. Жодино, 641300000001003100**
Номер лота	1
